ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 МАЯ 2013 г. ЧАЦВЕР № 87 (27452) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Салістка і стваральніца гурта Naka Анастасія Шпакоўская ўпэўнена, што працаваць трэба самаддана, а жыць, памятаючы наступнае: што пасееш — тое і пажнеш.

ЦЫТАТА ДНЯ

Марына АРЦЁМЕНКА, намеснік начальніка ўпраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны:

«Распрацаваны праект нарматыўнага прававога акта, які рэгламентуе парадак прыпынення дзейнасці ІП і некаторых іншых катэгорый асоб у перыяд догляду за дзіцем ва ўзросце да 3 гадоў. Сёння на заканадаўчым узроўні такога механізму няма. Дакумент знаходзіцца на разглядзе ва ўрадзе. Неабходнасць распрацоўкі такога дакумента была выклікана тым, што з 1 студзеня 2013 года ў краіне ўведзена норма, па якой ІП, а таксама натарыусам, адвакатам, рамеснікам выплата дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў прызначаецца ў памеры толькі 50%».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ПА БЫХАЎСКІЯ АРТЭФАКТЫ

Студэнты гістарычнага факультэта Магілёўскага педагагічнага ўніверсітэта працуюць на археалагічных раскопках каля сцен Быхаўскага замка.

(Працяг тэмы на 3-й стар. «ЧЗ».)

НА ВЫХАДНЫЯ ПРЫПЯЧЭ ДА ПЛЮС 32

У пятніцу і суботу месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы 12—18 цяпла, удзень у пятніцу будзе плюс 24—29, а па ўсходзе месцамі да 31, паведаміла **спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга Фядотава.** У суботу ўдзень увогуле чакаецца да 25—32 цяпла. У нядзелю кароткачасовыя дажджы і месцамі навальніцы. Уначы на нядзелю плюс 13—19, а ўдзень — 23—29.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, захаваецца даволі цёплае надвор'е і ў першыя дні наступнага тыдня. Месцамі чакаюцца кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Тэмпература ў панядзелак і аўторак уначы 11—17 цяпла, удзень — плюс 23—29 градусаў. А гэта ўжо амаль лета.

Сяргей КУРКАЧ.

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 25°
Віцебск	+ 26°
Гомель	+ 25°
Гродна	+ 28°
Магілёў	+ 27°
Мінск	+ 24°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.05.2013 г.

Долар ЗША	8650,00	▼
Еўра	11150,00	▼
Рас. руб.	275,00	▼
Укр. грыўня	1062,00	▲

ISSN 1990 - 763X

■ Анлайн-канферэнцыя

ДЗЯРЖПАДТРЫМКА СЕМ'ЯЎ З ДЗЕЦЬМІ

У Міжнародны Дзень сям'і, 15 мая, прайшла анлайн-канферэнцыя і прамая тэлефонная лінія намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Аляксандра РУМАКА.

Пра тое, ці будзе ў нашай краіне ўведзены падатак на бяздзетнасць, у якія тэрміны арганізацыя абавязана выплачваць штомесячныя дапамогі на дзяцей, ці будзе сёлета выплачвацца матэрыяльная дапамога на падрыхтоўку дзяцей да школы, ці можна атрымліваць дапамогу па месцы працы мужа, ці будзе ўводзіцца матчын (сямейны) капітал, чытайце ў нашым артыкуле, падрыхтаваным на падставе пытанняў, зададзеных падчас анлайн-канферэнцыі.

— Ці стаіць яшчэ на парадку дня пытанне аб увядзенні ў Беларусі падатку на бяздзетнасць?

— Не думаю, што ўвядзенне «халасцяцкага падатку» можа кардынальна паўплываць на паляпшэнне дэмаграфічнай сітуацыі. Аналіз статыстычных звестак сведчыць пра тое, што ў рэспубліцы большасць мужчын і жанчын уступае ў шлюб (62% мужчын і 52% жанчын знаходзяцца ў шлюбе па звестках перапісу насельніцтва).

Для нашай краіны ў цэлым характэрна невысокая ўдзельная вага асоб, якія на працягу ўсяго жыцця не ўступаюць у шлюб. Паказчык бясшлюбнасці і для мужчын, і для жанчын не перавышае 4%. Менавіта столькі тых, хто ніколі за ўсё жыццё не ўступіў у шлюб, сярод мужчын і жанчын ва ўзросце 50 гадоў і старэй.

Нельга таксама не ўлічваць дыспрапорцыі ў полаўзроставай структуры насельніцтва — на 1000 мужчын прыпадае 1152 жанчыны. Праблемы бясплоддзя сёння таксама актуальныя. Каля 15% шлюбных пар не могуць мець дзяцей па медыцынскіх прычынах.

СТАР 4

■ Гасцёўня «Звязды»

Алег НАВІЦКІ: «Я І ЦЯПЕР, КАЛІ ПАДАЮЦЬ ЗОРКІ, ЗАГАДВАЮ ЖАДАННІ»

Ураджэнца Чэрвеня Алега Навіцкага называюць трэцім беларускім касманаўтам, хоць па факце Алег Віктаравіч з'яўляецца грамадзянінам Расіі і першы свой палёт здзейсніў у якасці расійскага касманаўта. Але кожны адпачынак наш славуты зямляк імкнецца праводзіць у Беларусі, побач з блізкімі людзьмі. Прыехаўшы на родную зямлю ў чарговы раз, праз два месяцы пасля паўгадавога знаходжання на Міжнароднай касмічнай станцыі, Алег Навіцкі наведаў «Звязду». У пэўным сэнсе сімвалічна, што менавіта ён стаў першым госцем нашай канферэнц-залы, якая нядаўна з'явілася ў рэдакцыі.

Фота Надзеі БУЖАН.

СТАР 3

БПС-СБЕРБАНК

ОАО «БПС-Сбербанк» информирует об установлении с 17.05.2013 по срочному банковскому депозиту физических лиц в белорусских рублях «Юбилейный – 90 лет» следующего размера процентов:

Наименование депозита / сумма вклада	Срок привлечения / Размер процентов (годовых)
«Юбилейный – 90 лет»	190 дней
от 1 млн.	26

По депозитам, привлеченным до 17.05.2013, установленный размер процентов будет применен с 17.06.2013, но не ранее 90 дней со дня открытия депозита.

Дополнительную информацию можно получить в любом подразделении ОАО «БПС-Сбербанк», на сайте банка www.bps-sberbank.by или по телефону 148 в стационарной и мобильных сетях

Проценты, выплаченные по депозитам в белорусских рублях в течение 2012 г. (млрд. руб.): январь – 25,9; февраль – 27,7; март – 29,6; апрель – 27,1; май – 26,4; июнь – 23,2; июль – 21,6; август – 20,2; сентябрь – 16,6; октябрь – 16,9; ноябрь – 17,9; декабрь – 17,7.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь №4 от 10.10.2011 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673 ОАО «БПС-Сбербанк»

КУЗНЯ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ КРАІНЫ

Калектыву Установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт»

Дарагія сябры!

Сардэчна віншую вас з 80-годдзем з дня заснавання Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта.

За гэтыя гады ваш універсітэт набыў высокі аўтарытэт і атрымаў статус вядучай профільнай ВНУ Беларусі. Ён даў путёўку ў жыццё 138 тысячам спецыялістаў, якія дзякуючы глыбокім ведам і прафесіяналізму паспяхова працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі, уносячы годны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны. Сярод выпускнікоў ВНУ — вядомыя навукоўцы, дзяржаўныя дзеячы, кіраўнікі канцэрнаў, буйных прадпрыемстваў і арганізацый.

Праца калектыву ўніверсітэта, накіраваная на падрыхтоўку высокакваліфікаваных і ініцыятыўных спецыялістаў, якія думаюць сучасна, атрымала прызнанне не толькі ў Рэспубліцы Беларусь, але і за яе межамі.

Упэўнены, што Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт і надалей будзе дабівацца высокіх вынікаў у навуковай і адукацыйнай дзейнасці, садзейнічаючы павелічэнню інтэлектуальнага патэнцыялу Беларусі.

Зычу ўсім студэнтам, выкладчыкам і супрацоўнікам універсітэта шчасця і дабрабыту, новых здзяйсненняў на карысць Айчыны.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

АРМЕНІЯ — ВАЖНЫ ПАРТНЁР БЕЛАРУСІ Ў ЗАКАЎКАЗЗІ

Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў па выніках перагавораў з Прэзідэнтам Арменіі Сержам Саргсянам, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

На афіцыйных перагаворах у Ерэване ў вузкім і пашыраным складзе кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі ўвесь спектр двухбаковых адносін і дамовіліся аб сур'ёзнай актывізацыі супрацоўніцтва знешнепалітычных ведамстваў, парламентаў, а таксама аб прадаўжэнні ўзаемнай падтрымкі ў рамках міжнародных арганізацый.

«І Беларусь, і Арменія зацікаўлены ў паглыбленні адносін па ўсіх напрамках. У нас няма закрытых тэм у супрацоўніцтве, пачынаючы ад сферы сельскай гаспадаркі і да ваенна-палітычных пытанняў. Але на сённяшнім этапе наш галоўны прыярытэт — развіццё эканамічных кантактаў і пашырэнне двухбаковага гандлю», — лічыць беларускі лідар. Ён упэўнены, што цяперашні тавараабарот не адпавядае патэнцыялу дзвюх краін і ў бліжэйшыя гады яго можна павялічыць як мінімум у два разы.

«Нам неабходны сумесны пошук новых форм эканамічнага ўзаемадзеяння, уключаючы рэалізацыю сумесных прамысловых і інфраструктурных праектаў з прыцягненнем інвестыцый і ўкараненнем сучасных тэхналогій», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт Арменіі ў сваю чаргу адзначыў, што афіцыйны візіт кіраўніка беларускай дзяржавы праходзіць напярэдадні 20-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж дзвюма краінамі. «Да гэтай даты мы падыходзім, маючы не толькі адпаведны ўзровень двухбаковага супрацоўніцтва, але і з цвёрдым разуменнем таго, што набыты за гэтыя гады станоўчы вопыт міждзяржаўнага ўзаемадзеяння з'яўляецца нашым агульным здабыткам», — сказаў ён.

Па выніках перагавораў у прысутнасці прэзідэнтаў былі падпісаны некалькі двухбаковых пагадненняў. Сярод іх міжурадавае пагадненне аб абмене інфармацыяй і супрацоўніцтве ў галіне ядзернай бяспекі і радыяцыйнай аховы, міжурадавае пагадненне аб супрацоўніцтве ў забеспячэнні правоў асоб, якія належаць да нацыянальных меншасцяў, і іншыя.

НА АСНОВЕ МАДЭРНІЗАЦЫІ ЭКАНОМІКІ ПАВЫСІЦЬ ЖЫЦЦЁВЫ ЎЗРОВЕНЬ ЛЮДЗЕЙ

Больш як 5 тыс. прадпрыемстваў Беларусі маюць праграму мадэрнізацыі і пачалі ўжо яе рэалізацыю, паведаміў віцэ-прэм'ер Пётр Пракаповіч на адкрыцці Беларускага прамысловага форуму, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«У той час, — адзначыў віцэ-прэм'ер, — пакуль яшчэ 20-25 працэнтаў прадпрыемстваў рыхтуюцца да мадэрнізацыі, рыхтуюць праектна-каштарысную дакументацыю, бізнес-планы, крэдытныя лініі. Але ўжо ў бліжэйшыя 2-3 месяцы яны рэальна пачнуць выкананне сваіх праектаў».

«Комплексная мадэрнізацыя эканомікі ўсёй краіны прадугледжвае не толькі правядзенне тэхнічных пераўтварэнняў: укараненне найноўшых тэхналогій, дасягненняў навукі, прамысловасці, новых відаў тавараў і вырабаў. Гэты працэс таксама прадугледжвае эканамічную мадэрнізацыю, укараненне самых дасканалых сістэм кіравання, што будзе садзейнічаць павышэнню канкурэнтаздольнасці прадукцыі», — расказаў віцэ-прэм'ер.

Важна таксама, дадаў Пётр Пракаповіч, што тэхнічная мадэрнізацыя праходзіць на фоне вырашэння экалагічных праблем. «Будучыня сусветнай эканомікі — у аднаўляльных відах энергіі, гэта і наша перспектыва, таму, вырашаючы пытанні мадэрнізацыі на кожным асобным прадпрыемстве, мы не можам абыходзіць і гэтыя праблемы», — лічыць віцэ-прэм'ер.

■ Акадэміі МУС — 55

У ТРАДЫЦЫЯХ — БУДУЧЫНЯ

Пяцьдзясят пяць гадоў таму, 16 мая 1958 года, у Мінску расчыніла дзверы аддзяленне завочнага навучання Вышэйшай школы МУС СССР. З таго дня і вядзе свой гістарычны адлік айчынная Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў.

Больш за 60 тысяч супрацоўнікаў аховы правапарадку падрыхтавана тут за гэтыя гады. Выпускнікі Мінскай школы міліцыі накіроўваліся служыць па ўсім тагачасным СССР. Шэсць з іх сталі міністрамі ўнутраных спраў, многія выхаванцы займалі і сёння займаюць адказныя пасады ў органах кіравання нашай краіны і рэспублік СНД.

Адзначаючы чарговы юбілей і аддаючы даніну павагі сваёй гісторыі, Акадэмія ўпэўнена крочыць у дзень заўтрашні. Летась яна заняла першае месца сярод установ вышэйшай адукацыі сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі. Змагла акрэдытавацца і як навуковая арганізацыя. Тут вядуцца сур'ёзныя тэарэтычныя і практычныя распрацоўкі як у нацыянальных дзяржаўных інтарэсах, так і па міжнародных праграмах супрацоўніцтва. Прымаюць сюды для навучання і курсантаў з Расіі. У сваю чаргу, у рамках акадэмічных абменаў, беларускія курсанты накіроўваюцца на вучобу ў вядучыя ВНУ МУС Расіі.

Спецыялістаў для міліцыі заўтрашняга дня цяпер у Акадэміі рыхтуюць 20 дактароў,170 кандыдатаў навук, 23 прафесары і 112 дацэнтаў. Іх педагагічныя намаганні даюць вынік. За апошнія пяць гадоў 22 курсанты станавіліся прэзідэнцкімі стыпендыятамі, а 69 былі занесены ў рэспубліканскі банк адораных моладзі. І кожны год сотні выпускнікоў разлятаюцца са сваёй альма-матар па ўсёй краіне — служыць Айчыне, стаяць на варце закону і правапарадку.

Віктар ВІКЕНЦЬЕЎ

■

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Трэцякурснік Арцём ДАВІДОВІЧ працягвае прафесійныя традыцыі свайго дзеда, які ўсё жыццё праслужыў у міліцыі на транспарце.

■ Грошы

РУБЕЛЬ ЦІ ДОЛАР?

Цішыня ды супакой. Так скарочана можна ахарактарызаваць сітуацыю на валютным рынку Беларусі ў апошнія месяцы. Гэта пацвердзіў і Нацыянальны банк на пасяджэнні праўлення напрыканцы красавіка. Аднак давайце супаставім некалькі фактаў.

Насельніцтва краіны ў студзені-красавіку купляла валюты менш, чым прадавала. Радасны аргумент на карысць тэндэнцыі да змяншэння дэвальвацыйных і інфляцыйных чаканняў беларусаў. Але карані такой сітуацыі, на маю думку, ідуць даволі глыбока і ўпіраюцца ў высокія стаўкі па рублёвых дэпазітах. Трымаць рублі замест валюты выгадна на дэпазітах, а ўкладваць валюту — больш выгадна ў дзяржаўныя аблігацыі. Толькі з учарашняга дня стаўка рэфінансавання знізілася яшчэ на два працэнтныя пункты і, хутчэй за ўсё, будзе зніжацца надалей. Стаўкі па ўкладах таксама пойдуць уніз. Для асабліва палахлівых жыхароў гэта будзе добрай нагодай для перавядзення актываў у іншыя формы. І статыстыка па куплі валюты можа змяніцца.

Пасля гэтага можа павысіцца і курс. Ён і так не надта хоча зніжацца, колькі мы не чуем аб тым, што ў Амерыкі і Еўрапейскага саюза з эканомікай праблемы. Праблемы зараз амаль ва ўсіх, але пры гэтым, напрыклад, Германія (рухавік Еўрасаюза) прызнаецца інвестарамі самай прыцягальнай краінай у Еўропе. Таму грошы там будуць, эканоміка будзе працаваць, еўра не абрынецца. Тое самае адбываецца і ў ЗША, якія не дазволяць сваёй нацыянальнай валюце «працягнуць ногі». Значыць, асноўныя сусветныя грошы будуць заставацца больш-менш стабільнымі. Айчыннаму рублю зрабіць гэта значна складаней.

За апошнія чатыры месяцы 2013 года курс беларускага рубля часта змяняўся то ў адзін, то ў другі бок. Калі параўнаць сярэдні курс рубля да долара за студзень (8629,01) з апошнім значэннем (8650), то можна заўважыць невялікае павелічэнне (на 0,3%). С курсам да еўра адваротная сітуацыя (11453,06 і 11150 адпаведна) — зніжэнне на 2,5% (за апошнія двое тыдняў — 1,7%). Ваганні не такія ўжо і вялікія. Але хто ведае, колькі стане каштаваць валюта, калі попыт на яе значна павялічыцца. Статыстыку па расійскім рублі, які паказаў за той жа перыяд вялікае зніжэнне (на 3,6%), мы ў разлік браць не будзем, бо там курс залежыць больш ад цэн на нафту і іншых малапрадказальных фактараў, чым ад рэальнага стану эканомікі.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

■ Добрая навіна

Кафедральны храм асвечаны ў Тураве

У Тураве адбылося асвячэнне кафедральнага сабора ў гонар свяціцеляў Кірыла і Лаўрэнція Тураўскіх. Архітэктурны праект быў асабіста зацверджаны Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі Кірылам. Узвядзенне сабора ажыццяўлялася пры падтрымцы Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі.

Дарэчы, менавіта з тураўскіх земляў пачыналася праваслаўе ў нашым краі. З Турава распаўсюджвалася Евангельская вестка па тэрыторыі ўсёй Усходняй Еўропы больш за 1000 гадоў таму. Тут захаваўся падмурак старажытнага сабора, які датуецца XII стагоддзем. Сучасны сабор узведзены недалёка, у самым цэнтры невялічкага гарадка, дзе калісьці налічвалася да 70 цэрквяў. Падчас татарскіх набегаў былое ўдзельнае Тураўскае княства страціла палітычнае значэнне, але не страціла духоўнага аўтарытэту. На працягу некалькіх стагоддзяў Тураў заставаўся кафедральным горадам, і пытанне пра будаўніцтва новага сабора паднімалася неаднаразова. Так, на пачатку XX стагоддзя па ініцыятыве архіепіскапа Мінскага і Тураўскага Мітрафана (потым — свяшчэннапакутніка) пачаўся збор сродкаў на будаўніцтва сабора. Але Першая сусветная вайна і далейшыя трагічныя для праваслаўнай царквы гістарычныя падзеі не далі гэтым планам здзейсніцца. Будаўніцтва было адтэрмінавана на цэлае стагоддзе.

У 2008 годзе па асабістым указанні Аляксандра Лукашэнкі быў выдзелены зямельны ўчастак пад будаўніцтва сабора. Тры гады таму Мітрапалітам Мінскім і Слуцкім Філарэтам быў закладзены першы камень у падмурак, а сёлета ў студзені адбылося асвячэнне і ўзняцце званоў на пабудаваную званіцу.

У вітальным адрасе мітрапаліта Філарэта адзначаецца роля святога Кірыла Тураўскага для нашчадкаў: «Свяціцель Кірыл Тураўскі вылучаецца сярод многіх іншых услаўленых святых шматграннасцю сваёй асобы і багаццем здольнасцяў. Ён — настаўнік набожнасці і арганізатар адукацыі. Ён — выдатны прапаведнік і аўтар багаслоўскіх твораў. Ён — выдатны паэт і строгі аскет. Свяціцеля Кірыла завуць Залатавустам, работы і подзвігі яго адыгралі выключную ролю ў станаўленні адукацыі і асветы на нашых землях і зрабілі яго вядомым далёка за межамі свой радзімы. Сваім выдатным жыццём святы Кірыл Тураўскі паказаў, што ў душы, якая здабыла адзінства з Хрыстом і Яго Царквой, могуць гарманічна спалучацца вера і розум, глыбокая рэлігійнасць і рознабаковая адукаванасць».

Чын асвячэння сабора і літургію ўзначаліў кіраўнік справамі Беларускай Праваслаўнай Царквы архіепіскап Навагрудскі і Лідскі Гурый. Разам з ім служылі пяць епіскапаў, якія прыехалі на Тураўскую зямлю з Беларусі і Украіны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

■

ЯК СТАЦЬ ШЧАСЛІВАЙ СЯМ'ЁЙ?

Да Міжнароднага дня сям'і аддзел ЗАГС Магілёўскага гарвыканкама віншуе з заручынамі жаніхоў і нявест.

Менавіта 15 мая магілёўцы падавалі заявы на рэгістрацыю шлюбаў у першай палове жніўня, а гэта самы папулярны час для вялікіх вяселляў і «гарачая» пара для ЗАГСаў.

— З моманту падачы заявы жанчына і мужчына афіцыйна становяцца нявестай і жаніхом, — патлумачыла начальнік аддзела ЗАГС Магілёўскага гарвыканкама Галіна Аношка. — З нагоды Дня сям'і 15 мая мы ўрачыста віншавалі пары і ўручалі памятку, як рыхтавацца да вяселля.

Акрамя гэтага, дзверы гістарычнага будынка Палаца шлюбу ў Магілёве адкрыліся для экскурсій навучэнцаў гарадскіх каледжаў. Ім паказваюць не толькі прыгожыя памяшканні для ўрачыстых цырымоній, але і расказваюць пра шлюб і сям'ю, даюць парады на будучае.

Ілона ІВАНОВА.

«Я І ЦЯПЕР, КАЛІ ПАДАЮЦЬ ЗОРКІ, ЗАГАДВАЮ ЖАДАННІ»

Фота Надзеі БУЖАН.

9 Мая я ўдзельнічаў у святочным шэсці, ішоў разам з Прэзідэнтам. Гэта мяне прыемна здзівіла, бо, шчыра кажучы, я думаў прайсці ў дальніх радах.

ЧАРАЎНІК УЛАСНАГА ЛЁСУ

— Калі я быў зусім маленькім, — распавёў Алег Віктаравіч, — вядома ж, марыў стаць касманаўтам. Але я нават не ведаў, як гэта зрабіць і дзе іх увогуле рыхтуюць, таму пайшоў па шляху максімальнага набліжэння да мары — у ваенную авіяцыю, потым служыў.

Тое, што для многіх савецкіх хлопчыкаў так і засталося дзіцячай марай, Алег Навіцкі, як сапраўдны чараўнік (альбо проста мэтанакіраваны чалавек, што, зрэшты, адно і тое ж), здолеў увасобіць у жыццё.

— Калі з'явілася магчымасць, я прайшоў адбор у касманаўты. Гэта абсалютна рэальна, — запэўніў Алег Навіцкі, — трэба проста займацца спортам, добра вучыцца і валодаць патрэбнай інфармацыяй.

Але ўніклівыя журналісты не паверылі, што ўсё так проста. І праўда: нам удалося раскрыць яшчэ адзін, пэўна, галоўны сакрэт поспеху касманаўта:

— Я і цяпер, калі падаюць зоркі, загадваю жаданні. Але каб яны здзяйсняліся, трэба ісці да сваёй мэты, не проста марыць, а штосьці для гэтага рабіць.

ВЫПРАБАВАННЕ... УСЕАГУЛЬНАЙ УВАГАЙ

Алег Навіцкі прызнаўся, што, нягледзячы на ўсю ўразлівасць космасу, на Зямлі застаюцца блізкія людзі — родныя, сябры, па якіх ён вельмі сумуе.

— Трэба разумець, што гэта — работа, — адзначыў Алег Віктаравіч і падзяліўся падрабязнасцямі з жыцця па-за зямной гравітацыяй. — Мы спалі ў спецыяльных мяшках накшталт турыстычных, якія прымацоўвалі да сценкі каюты. Калі я прачынаўся, у мяне было падсвядомае адчуванне, што я спаў на баку. І нават з'яўлялася жаданне перавярнуцца на спіну і спусціць ногі з ложка. Пасля палёту доўга прывыкаць да «нармальных» побытавых умоў не давялося: арганізм адразу ўзгадаў, што такое канапа і ложак, а спіна «ўзрадавалася», адчуўшы апору.

Аднак праца касманаўта не абмяжоўваецца толькі палётамі. Большасць часу займае падрыхтоўка да і рэабілітацыя пасля іх. І нават падчас адпачынку і свят графік Алега Навіцкага распісаны ледзь не пахвілінна.

— Восьмага мая мы прыехалі ў дзве гадзіны ночы, а раніцай ужо былі на Кургане Славы. 9 Мая я ўдзельнічаў у святочным шэсці, ішоў разам з Прэзідэнтам. Гэта мяне прыемна здзівіла, бо, шчыра кажучы, я думаў прайсці ў дальніх радах. А ён фактычна паставіў мяне побач з сабой, і я яму вельмі ўдзячны за магчымасць ускласці кветкі разам з ветэранамі і павіншаваць іх са святам. А пасля я паехаў у Чэрвень, каб адзначыць свята ў сямейным коле. Дома правёў вельмі мала часу, бо адразу пасля прыезду пачаліся сустрэчы з журналістамі, мама ажно абуралася. А ў выхадныя (*размова адбывалася ў панядзелак*. — **Аўт.**) я зноў паеду ў Зорны гарадок.

Нельга было сабрацца ў рэдакцыі газеты і не закрануць тэму журналістыкі. За некалькі дзён

«Знаходзіцца ў эпіцэнтры ўсеагульнай ўвагі больш цяжка, чым рыхтавацца да палёту ў космас, — зрабіў выснову Алег Навіцкі. — Мая жонка — журналіст, і яна звычайна мяне супакойвае ў справах стасункаў са СМІ».

знаходжання ў Беларусі касманаўт ужо крыху стаміўся ад пільнага рэпарцёрскага вока.

— Знаходзіцца ў эпіцэнтры ўсеагульнай увагі больш цяжка, чым рыхтавацца да палёту ў космас, — зрабіў выснову Алег Навіцкі. — Мая жонка — журналіст, і яна звычайна мяне супакойвае ў справах стасункаў са СМІ. Я разумею, што журналістам патрэбны «смажаныя» факты, але дарослыя людзі павінны разумець, што можна выстаўляць, а што нельга. Таму цяпер я стараюся вычытваць матэрыялы, якія датычацца мяне, хоць раней гэтага не рабіў. Даводзілася знаходзіць на гэта час нават у космасе.

У ПЛАНАХ — НОВЫЯ ПАЛЁТЫ

Вядома ж, мы не маглі не распытаць госця аб тым, як рыхтуюць сучасных касманаўтаў.

— Раней касманаўтамі маглі быць толькі лётчыкі. Сёння наш Цэнтр (*Цэнтр падрыхтоўкі касманаўтаў*. — **Аўт.**) зрабілі цалкам цывільным, і набор у касманаўты адбываецца «адкрытым» метадам. Любы ахвотны можа азнаёміцца на сайце з пералікам патрабаванняў і пачаць праходзіць адбор.

Алег Віктаравіч выказаў меркаванне, што гэта не вельмі добра, бо ў Цэнтр прыходзяць людзі, непрыдатныя да прафесіі па розных прычынах.

— І адмовіць ім нельга — бо маюць права, але насамрэч яны толькі забіраюць час у спецыялістаў. Раней было проста: рассылалі загад па часцях і збіралі людзей, — узгадаў Алег Навіцкі.

Сёлета наш зямляк здзейсніў свой першы палёт у космас. Але спыняцца на гэтым ён і не думае.

— Спадзяюся, што восенню паспяхова прайду медкамісію. І тады — пакуль што гэта «акрэслена алоўкам» — бліжэйшыя палёты ў мяне будуць запланаваны на 2017-ы і 2020 гады.

Такі значны прамежак часу паміж палётамі патрэбны, зноў жа, для падрыхтоўкі і рэабілітацыі касманаўтаў. Ці жарт — аднавіць арганізм пасля знаходжання ў анамальных для яго ўмовах. І тым не менш, адзін касманаўт звычайна лятае да зор некалькі разоў.

— Колькасць палётаў у космас залежыць ад стану здароўя, — патлумачыў наш госць і прывёў прыклад. — Вось цяпер паляцеў Павел Вінаградаў, якому на арбіце споўніцца 60 гадоў. Гэта ўжо яго трэці палёт. Увогуле прафесія касманаўта патрабуе вялікіх выдаткаў, таму рыхтаваць чалавека толькі да аднаго палёту нават эканамічна нявыгадна. Ён павінен працаваць па поўнай праграме — гэта ўсе добра разумеюць. Касманаўт не толькі павінен вытрымаць усе звязаныя з палётам перагрузкі, але і выканаць пастаўленыя перад ім задачы.

Цяпер максімальная колькасць палётаў — шэсць — у начальніка нашага Цэнтра. Ён лятаў на «Шатле», «Саюзе».

НЕ ЖАНОЧАЯ ГЭТА СПРАВА...

Нягледзячы на каласальныя перагрузкі для арганізма, даследаваць космас імкнуцца не толькі мужчыны, але і слабы пол — калі ўвогуле можна так сказаць пра жанчын-касманаўтаў.

— Цяпер у нас ёсць дзве жанчыны ў атрадзе. Адна рыхтуецца да палёту ў 2014 годзе, другая пакуль толькі праходзіць агульнакасмічную падрыхтоўку, наперадзе яе чакае дзяржэкзамен, — увёў нас у курс справы Алег Віктаравіч. — Ён уяўляе сабой вялікі тэарэтычны іспыт, па выніках якога набываецца статус касманаўта-выпрабавальніка. Каб яго атрымаць, трэба вывучаць розныя дысцыпліны, трэніравацца. Пасля гэтага кожнаму выдаецца характарыстыка і вызначаецца прыдатнасць да прафесіі.

Па словах Алега Навіцкага, жанчыны здаюць іспыт па тых жа крытэрыях, што і мужчыны, ніякіх патураняў ніхто не робіць. Але наш госць перакананы, што палёты ў космас — не жаночая справа.

— Большасць экіпажа складаюць мужчыны, і ў іх паміж сабой не ўзнікае праблем у этычным і гігіенічным плане. А калі ў экіпажы прысутнічае жанчына, ствараюцца пэўныя нязручнасці.

Мы пацікавіліся: а калі, напрыклад, цалкам жаночы экіпаж?

— Разваляць станцыю! — засмяяўся касманаўт.

Тым не менш на вывучэнне прасторaў Сусвету накіроўваюцца не толькі жанчыны, але нават і сямейныя пары. Касманаўт з Беларусі распавёў:

— Зараз ляціць Алена Сярова. Яна была ў атрадзе разам з мужам, хацелі лятаць разам. Але ж гэта значыць — кінуць сям'ю, дзіця. Я не лічу, што гэта піяр, але ўсё ж, на маю думку, гэта лішняе.

Сам Алег Навіцкі з усмешкай прызнаўся, што з жонкай у космас не паляцеў бы.

— Такое пытанне нават не абмяркоўвалі. У нас розныя інтарэсы ў гэтым плане.

РАЗАМ ЛЯЦІМ ДА ЗОР

Алег Навіцкі з горыччу адзначыў, што сённяшні статус касманаўта не такі, якім быў у Савецкім Саюзе, і што цяпер дзецям гэта нецікава.

— Раней школьнікі ведалі колькасць касманаўтаў, а цяпер яе ведаюць толькі самі касманаўты. Вось я па ліку 114-ы касманаўт у Расіі, пачынаючы ад Гагарына.

Мы пацікавіліся: а калі, напрыклад, цалкам жаночы экіпаж?
— Разваляць станцыю! — засмяяўся касманаўт.

Вялікае пытанне, ці змогуць сённяшнія школьнікі назваць імёны першых беларускіх касманаўтаў. Але наш госць не забываецца на іх, сваіх папярэднікаў, — двойчы Герояў Савецкага Саюза, генерал-палкоўнікаў авіяцыі ў адстаўцы Пятра Клімука і Уладзіміра Кавалёнка.

— Клімук і Кавалёнак — заслужаныя людзі, якія маюць «вагу», — выказаўся аб славутых беларусах Алег Навіцкі. — Я сустракаўся з імі абодвума перад палётам. Палічыў патрэбным паразмаўляць з імі, таму што яны маюць вопыт. Хоць бачымся мы нячаста, але я стараюся падтрымліваць з імі сувязь.

Па словах Алега Віктаравіча, цяпер на арбіце ёсць яшчэ адзін выхадзец з Беларусі, Алег Арцем'еў, у якога адсюль паходзяць дальнія сваякі. Таму нашу краіну можна назваць калі і не касмічнай дзяржавай (хоць мы да гэтага імкнёмся!), то хаця б «пастаўшчыком» кадраў у касманаўтыку. Ды і ўвогуле, калі паглядзець на гэтае пытанне па-філасофску, дзяржаўная прыналежнасць не павінна быць нагодай для спрэчак. Бо яшчэ ў дакасмічную эпоху Максім Багдановіч сказаў:

Нашто ж на зямлі
Сваркі і звадкі, боль і горыч,
Калі ўсе мы разам ляцім
Да зор?

Гутарка з касманаўтам была настолькі цікавай, што ўдвая перавысіла запланаваны на сустрэчу час. З рэдакцыі «Звязды» Алег Навіцкі выйшаў з памятнымі падарункамі і, спадзяёмся, добрымі ўражаннямі.

Падрыхтавала Дзіяна СЕРАДЗЮК.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Без бар'ераў

У МІНСКУ СТАРТУЕ ТЫДЗЕНЬ ДАСТУПНАСЦІ

На нашых вуліцах паранейшаму досыць рэдка можна сустрэць людзей, якія перасоўваюцца на калясцы ці выкарыстоўваюць белы кій. І не таму, што іх у нас вельмі мала. Проста большасць людзей з абмежаванымі магчымасцямі часцей сядзець дома, таму што некамфортна адчуваюць сябе ў грамадскіх месцах.

Таму з 17 па 21 мая ў межах кампаніі «Даступнасць» упершыню ў Беларусі пройдзе Тыдзень даступнасці. Галоўная яго задача: садзейнічанне ліквідацыі ўсялякіх бар'ераў для людзей з інваліднасцю — ментальных, архітэктурных, эканамічных, прававых, а таксама пашырэнне паняцця даступнасці ў свядомасці грамадскасці.

ПРАГРАМА

17 мая, пятніца

16.00—17.30 Публічная лекцыя «Даступнасць як крытэрый якасці жыцця людзей з інваліднасцю». Алена Ярская-Смірнова (Расія).

18.00 Цырымонія адкрыцця Тыдня даступнасці (*па запрашальніках*).

18 мая, субота

15.30—16.00 Дакументальны фільм «Цярпенне і праца ўсё перамогуць».

16.00—18.00 Публічная дыскусія «Даступнасць працаўладкавання для людзей з інваліднасцю».

18.00—19.00 Дакументальны фільм «Асаблівыя людзі».

19 мая, нядзеля

14.00—17.00 Форум «Даступнасці».

17.30—19.00 Публічная лекцыя «Універсальны дызайн як сродак забеспячэння роўнасці» Наталля Лазоўская (Беларусь).

19.00 Дакументальны фільм «Адно пытанне».

19.30 Мастацкі фільм «Папялушка з левай нагі»

20 мая, панядзелак

14.00—16.00 Майстар-клас «Як зрабіць даступны сайт»? Аляксандр Севярын (Беларусь).

16.00—18.00 Практычны майстар-клас «Маніторынг безбар'ернага асяроддзя». Галіна Крот, Яўген Шаўко (Беларусь).

18.00—18.30 Цырымонія ўзнагароджання пераможцаў конкурсу на сімвал «Даступнасць».

18.30—19.30 Прэзентацыя ролікаў сацыяльнай рэкламы па тэме праблем людзей з інваліднасцю.

21 мая, аўторак

14.30—16.00 Дакументальны фільм «Я гавару (на мове жэстаў), я жыву».

16.00—17.30 Публічная лекцыя «Даступнасць навакольнага свету і шляхі адвакатавання заканадаўства аб даступнасці». Капко Панаётава (Балгарыя).

18.00—19.00 Мастацкі фільм «Цырк матылькоў».

Усе мерапрыемствы адбудуцца па адрасе: г. Мінск, пр. Пераможцаў, 49, Галерэя «Prezentацыя». Уваход вольны.

Святлана БУСЬКО

■

ДЗЯРЖПАДТРЫМКА СЕМ'ЯЎ З ДЗЕЦЬМІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Улічваючы гэтыя лічбы, паступленні ў бюджэт ад такога падатку будуць нязначныя, а сацыяльны эфект — неадназначным. Увядзенне так званага «падатку на халасцякоў» не можа прынцыпова паўплываць на змяненне жыццёвых установак, з'явіцца стымулам да ўступлення ў шлюб або нараджэння дзіцяці. Гэта асабістае рашэнне і ўсвядомлены выбар кожнага чалавека, які павінен быць вольны ад любога ціску з боку дзяржавы. Таму пытанне аб увядзенні такога падатку не разглядаецца.

— Ці будзе сёлета выплачана матэрыяльная дапамога беларускім сем'ям на падрыхтоўку дзяцей да школы? Якімі будуць памеры гэтай дапамогі?

— Выплата аднаразовай матэрыяльнай дапамогі да навучальнага года сем'ям, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей, якія навучаюцца ва ўстановах агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, рэалізуецца з 2012 года ў рамках Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі. Памер матэрыяльнай дапамогі складае да 30% бюджэту пражытачнага мінімуму, дзейнага на 1 жніўня каляндарнага года, на кожнага навучэнца.

Гэтыя выплаты робяцца са сродкаў мясцовых бюджэтаў, таму канкрэтныя памеры, а таксама дадатковыя катэгорыі сем'яў, якім такая дапамога можа быць аказана, вызначаюцца мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, зыходзячы з іх фінансавых магчымасцяў.

Акрамя таго, дапамога да школы таксама аказваецца ў рамках калектыўных дагавораў прадпрыемстваў, арганізацый.

— Калі будуць унесены змены ў заканадаўства аб дапамозе па доглядзе дзяцей да 3 гадоў у дачыненні да рамеснікаў, індывідуальных прадпрымальнікаў, адвакатаў і натарыусаў? І ці прадугледжваецца кампенсацыя «страчаных» з 1 студзеня сум дапамог?

— Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» уступіў у сілу з 1 студзеня 2013 года. У адпаведнасці з нормамі новага закона, калі асоба, якая ажыццяўляе догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, прыватным натарыусам, адвакатам альбо ажыццяўляе рамесную дзейнасць, дапамога па доглядзе дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў выплачваецца ў памеры 50% ад устаноўленага памеру. Пытанне аб унясенні змяненняў у дзейны закон не разглядаецца.

Разам з тым, улічваючы, што ў заканадаўстве, якое рэгулюе ажыццяўленне індывідуальнай прадпрымальніцкай, адвакацкай, прыватнай натарыяльнай або рамеснай дзейнасці, не прадугледжана магчымасць яе прыпынення ў сувязі з доглядам дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, падрыхтаваны праект Указа, які прадугледжвае парадак прыпынення такой дзейнасці і выплаты дапамогі па доглядзе дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў у перыяд прыпынення ў поўным памеры. Сёння гэты праект знаходзіцца на разглядзе ва ўрадзе.

Па звестках перапісу насельніцтва 2009 года, у Беларусі налічваецца каля 2,7 млн сем'яў, з іх 45% маюць дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў.

— У поўнай сям'і выхоўваецца дзіця-інвалід. Бацька дзіцяці — індывідуальны прадпрымальнік, які ў 2012 годзе не ажыццяўляў прадпрымальніцкую дзейнасць і не выплачваў страхавыя ўнёскі. Ці будзе сям'я мець права на дапамогу на дзяцей, старэйшых за 3 гады, з асобных катэгорый сем'яў, калі бацька зараз выплаціць страхавыя ўзносы за 6 месяцаў 2012 года?

— Дзяржаўная дапамога прызначаецца, калі працаздольны бацька ў поўнай сям'і альбо працаздольны бацька ў няпоўнай сям'і працуе або ажыццяўляе іншы від дзейнасці ў Беларусі, які прыносіць заробак (даход).

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 студзеня 2009 г. № 40 устаноўлена, што індывідуальныя прадпрымальнікі вылічваюць сумы страхавых узносаў, якія падлягаюць да выплаты, з сумы памераў мінімальнай заработнай платы, устаноўленай заканадаўствам і праіндэксаванай у месяцах ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці, пры ўмове атрымання ад названай дзейнасці даходу. Такім чынам, выплата страхавых узносаў наўпрост звязана з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай дзейнасці.

Улічваючы, што працаздольны бацька ў 2012 годзе не выканаў умову занятасці, паколькі не ажыццяўляў прадпрымальніцкую дзейнасць, сям'я не мае права на прызначэнне дзяржаўнай дапамогі сёлета.

— Жанчына знаходзіцца ў працоўных адносінах, зараз у водпуску па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў. Паступіла ў ВНУ на дзённую форму навучання. Дзе ёй павінны выплачваць дапамогу па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і ў якім памеры?

— У гэтай сітуацыі выплата дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў па месцы працы павінна быць спынена. Жанчыне выдаецца даведка аб памеры дапамогі на дзяцей і перыядзе яе выплаты. Дапамога прызначаецца па месцы вучобы з дня, наступнага за днём спынення яе выплаты па месцы працы, у поўным памеры.

— Скажыце, калі ласка, які парадак прызначэння дапамогі на дзіця да 3 гадоў у поўнай сям'і? Мы абое працуем, дапамогу на дзіця атрымліваю ў сябе на працы, аднак перыядычна яе выплату затрымліваюць (арганізацыя камерцыйная). Ці можна нам атрымліваць дапамогу па месцы працы мужа?

— У поўнай сям'і дзяржаўная дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў прызначаецца па месцы працы (службы), вучобы, праходжання падрыхтоўкі ў клінічнай ардынатуры маці (мачахі) дзіцяці. У выпадку, калі маці (мачыха) у поўнай сям'і не працуе (не служыць), не вучыцца, не праходзіць падрыхтоўку ў клінічнай ардынатуры, дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў прызначаецца па месцы працы (службы), вучобы, праходжання падрыхтоўкі ў клінічнай ардынатуры бацькі (айчыма) дзіцяці.

Такім чынам, у адпаведнасці з нормамі Закона дапамогу па доглядзе дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў варта выплачваць па месцы вашай працы.

У 2012 годзе ў нашай рэспубліцы нарадзілася 116 тысяч дзяцей.

Дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі, якія прызначаюць і выплачваюць дзяржаўныя дапамогі, абавязаны забяспечваць іх своечасовую выплату. У выпадку парушэння згаданым органам (арганізацыяй) тэрмінаў выплаты дзяржаўных дапамог вы маеце права звярнуцца ў суд.

— Ці знята з парадку дня пытанне ўвядзення ў Беларусі матчынага (сямейнага) капіталу?

— Пытанне прапрацавана НДІ працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Па выніках навукова-даследчай работы зроблена выснова аб тым, што ўвядзенне дадатковых захадаў эканамічнай падтрымкі сям'і ў рамках «сямейнага» капіталу мэтазгодна з 2016 года. Пры распрацоўцы праекта Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі да 2020 года гэтае пытанне будзе разглядацца з улікам фінансавых магчымасцяў дзяржавы.

— Чаму для вызначэння памеру дапамогі не ўлічваюцца дзеці, старэйшыя за 18 гадоў, калі яны з'яўляюцца студэнтамі дзённай формы навучання і атрымліваюць першую вышэйшую адукацыю? Няўжо гэтае дзіця ўжо не з'яўляецца «па законе» маім дзіцем і не мае патрэбу ў матэрыяльнай падтрымцы з боку маці?

— Несумненна, што для бацькоў дзіця ў любым узросце застаецца дзіцем. Разам з тым Законам аб правах дзіцяці вызначана, што дзіцем з'яўляецца асоба, якая не дасягнула ўзросту 18 гадоў. Па дасягненні 18-годдзя грамадзянінам набываецца поўная дзеяздольнасць. У сувязі з гэтым для мэтаў прызначэння дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў у складзе сям'і ўлічваюцца дзеці ва ўзросце да 18 гадоў. Пры гэтым для аднаразовай дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці ўлічваюцца народжаныя маці дзеці любога ўзросту, у тым ліку старэйшыя за 18 гадоў.

Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.

■ «Еўрабачанне-2013»:

БЕЛАРУСЬ — У ФІНАЛЕ!

У аўторак, 14 мая, у шведскім Мальмё стартаваў конкурс «Еўрабачанне-2013». Прадстаўніца Беларусі Алена Ланская па выніках свайго выступлення ў гэты дзень прайшла ў фінал шоу. Гэта ўсяго трэцяе падобнае дасягненне Беларусі за 10 гадоў удзелу ў «Еўрабачанні».
Як заўважылі ўжо многія крытыкі, «выстрэльваць» беларускім выканаўцам удаецца раз на тры гады: у 2007-м суайчыннікаў упершыню парадаваў Дзмітрый Калдун, у 2010 — гурт «3+2», і вось сёлета — самая маладая заслужаная артыстка Беларусі Алена Ланская. Яшчэ адно супадзенне — а можа, заканамернасць? — ва ўсіх гэтых выпадках нумары рыхтаваліся інтэрнацыянальнымі камандамі.

У фінал ідуць адны прыгажуні

Як заўважылі нават не самыя пільныя гледачы, першы паўфінал сёлета быў вельмі насычаны цягучымі баладамі і прыгожымі дзяўчатамі. Што адбілася і на выніках: 7 з 10 шчаслівых фіналістаў — салісткі-прыгажуні. Гэта сёлетняя фаварытка букмекераў, 19-гадовая спявачка з Даніі Эмелі дэ Форэст, чароўная прадстаўніца Эстоніі Біргіт, якая ўсяго праз некалькі месяцаў стане мамай, леташняя бэк-вакалістка прадстаўніка Малдовы, а сёлета самастойная канкурсантка Алена Мун, сталейшая за ўсіх паўфіналістак 38-гадовая спявачка Анук з Нідэрландаў, галасістая дзюймовачка з Украіны Злата Агневіч, беларуска Алена Ланская і яшчэ маладзейшая за яе заслужаная артыстка Татарстана, расіянка Дзіна Гарыпава.

Кампанію ім склалі тры хлопцы: Раян Долан з Ірландыі, пераможца праекта «Голас Бельгіі» Раберта Дэлароза і прадстаўнік Літвы Андрыус Паявіс.

Затое ўпершыню за апошнія некалькі гадоў пакуль што ніводная з балканскіх краін-паўфіналістак далей не прайшла.

Дарэчы, на прэс-канферэнцыі пераможцаў паўфіналу адбылося папярэдняе лёсаванне чарговасці выступленняў у фінале конкурсу. Беларусь, Расія, Малдова, Літва, Нідэрланды, Бельгія і Эстонія выступяць у першай палове шоу, а Украіна, Ірландыя і Данія — у другой.

На гэтай жа прэс-канферэнцыі журналісты спыталі Алену, што яна хацела данесці да аўдыторыі сваёй кампазіцыяй. «Гэта песня пра шчасце і каханне, — з заўсёднай усмешкай распавяла спявачка. — Цяпер мне не хапае маёй сям'і, і я хацела данесці свае пачуцці да яе. Таксама спадзяюся, што кожны чалавек адчуваў сябе шчаслівым, калі слухаў маю песню».

Дзень адпачынку — і шоу павінна працягвацца

— Калі, нарэшце, я пачуў «Беларусь», то зямля сплыла з-пад ног, — прызнаўся «Звяздзе» **прадзюсар спявачкі Дзмітрый БАРАНАЎ**. — Не памятаю, што я рабіў, — ачуняў толькі, убачыўшы, як Алена радуецца і як уся наша каманда лікуе і скача ледзьве не да столі.

— Многія адзначылі, што Алена падчас выступлення вельмі хвалявалася, нават голас крыху асіп. Можа, дасце ёй крыху адпачыць?

— Паколькі мы з 4 мая ў Мальмё і не было ніводнага дня без рэпетыцый, заняткаў з харэографам і педагогам па вакале, інтэрв'ю і выступленняў, то, натуральна, усе вельмі стаміліся. Таму 15 мая вырашылі адвесці адзін дзень для рэлаксу, псіхалагічнай і фізічнай разгрузкі. А потым зноў да працы — у нас вельмі многа цікавых прапаноў, дый да фіналу неабходна падрыхтавацца як след. За голасам Алены, спяшаюся супакоіць усіх прыхільнікаў, пільна сочыць урач-фаніятар: кожны дзень пачынаецца і завяршаецца яе кансультацыяй, і ўсё ў межах нормы. Што да хвалявання — яно было і яшчэ будзе, але гэта, мабыць, і станоўчы фактар для больш яркага выступлення?

— Ці зменіцца штось у нумары Алены да фіналу? Або ў гэтым выпадку лепшае — вораг добрага?

— У нас вельмі крэатыўная каманда, і ўжо ёсць некалькі ідэй-нюансаў, якія маглі б упрыгожыць нумар. Але будзем яшчэ раіцца з рэжысёрскай групай, ці варта гэта рабіць, бо магчымасцяў адпрацаваць усё да дробязяў ужо не будзе. Кардынальна штось мяняць, безумоўна, мы не станем, я і сам супраць, але пэўныя «фішкі» можам дадаць.

Другі паўфінал «Еўрабачання» беларуская каманда збіраецца глядзець у зале, каб адчуць атмасферу конкурсу па-за сцэнай і падтрымаць сваіх сяброў — прадстаўніка Азербайджана Фарыда Мамедава (азербайджанская дэлегацыя жыве з беларусамі ў адным атэлі, і нават педагог па вакале ў нашых канкурсантаў адзін на дваіх), гурт з Грэцыі «Koza Mostra» ды іншых.

Скандынаўскі блок супраць усходняга

Сёння прадстаўнікі яшчэ 17 краін паспрабуюць выйграць шчаслівыя білеты ў фінале «Еўрабачання-2013». На сцэну «Мальмё-Арэны» выйдуць (у парадку чарговасці) канкурсанты з Латвіі, Сан-Марына, Македоніі, Азербайджана, Фінляндыі, Мальты, Балгарыі, Ісландыі, Грэцыі, Ізраіля, Арменіі, Венгрыі, Нарвегіі, Албаніі, Грузіі, Швейцарыі і Румыніі. Трансляваць паўфінал і галасаваць у ім будуць таксама ўдзельнікі «вялікай пяцёркі» краін — заснавальнікаў конкурсу: Іспанія, Францыя і Германія.

У адрозненне ад першага паўфіналу, другі абяцае быць больш «мужным» і месцамі нават брутальным. Напрыклад, прадстаўнікі Арменіі гурт «Dorians» дадуць дыхту песняй у стылі цяжкі рок, кампазітарам якой выступіў легендарны музыкант Тоні Аёмі з «Black Sabbath». Рок-песняй парадуе прыхільнікаў жанру і артыст-вікінг з Ісландыі Эйтоур Інгі Гюнлёйгсан.

Да каго яшчэ варта прыгледзецца больш уважліва? Напрыклад, да прадстаўніцы Сан-Марына. Гэта краіна з ліку навічкоў, а значыць, даволі непрадказальных удзельнікаў. Цяперашняя, яна ж леташняя, удзельніца Валянціна Манета прадстаўляе ўсяго 4-ю спробу краіны ўзабрацца на еўрапейскі поп-алімп. Летась гэтая спроба скончылася для спявачкі 14-м месцам у паўфінале. Ці пашанцуе сёлета? Паслухаем, паглядзім.

У складзе швейцарскага гурта «Takasa» выступіць 95-гадовы кантрабасіст Эміль — гэта самы пажылы ўдзельнік не толькі сёлетняга «Еўрабачання», але і конкурсу ўвогуле.

І, безумоўна, асаблівы інтарэс выклікае пытанне, чым скончыцца выпадковае ці наўмысна зладжанае музычнае супрацьстаянне скандынаўскіх і ўсходніх краін: каго з іх у выніку ў фінале «Еўрабачання-2013» будзе больш?

Вікторыя ЗАХАРАВА. Фота БЕЛТА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

16 МАЯ 2013 г.
ЧАЦВЕР
№ 11 (15720)

Выдаецца
з 21 красавіка 1921 года

Фота з сайта nata.by.

Анастасія ШПАКОЎСКАЯ:

«МОЖНА СМЕЛА СКАЗАЦЬ: Я — «ЗАДАВОЛЕНА»

Гурт Naka вядомы перш за ўсё ў коле прыхільнікаў беларускай рок-музыкі. Яго гісторыя налічвае ўжо амаль дзясятак гадоў. За гэты час было шмат конкурсаў, «кадравых» перастановак у калектыве, што ў выніку пацвердзіла, на маю думку, галоўнае: сапраўдная творчасць з часам не знікае. Нядаўна Naka прэзентавала свой трэці альбом «Задаволена». Ён кранае глыбінёй тэкстаў і вясёлкай настрояў. Сустрэўшыся з салісткай і стваральніцай гурта Анастасіяй Шпакоўскай, я зразумела іх сакрэт. Працаваць трэба самаддана, а жыць, памятаючы наступнае: што пасееш — тое і пажнеш.

— Раскажыце, як праходзіла праца над новым альбомам?

— Было цікава. Мы супрацоўнічалі з маладым гукарэжысёрам Анатолем Шманаем. Першы раз падчас запісу мы дазволілі сабе нейкія эксперыменты, нешта прыдумвалі спантанна. Праца над альбомам — заўсёды справа не простая, тым больш, што я ўсе кампазіцыі дапрацоўваю з гукарэжысёрам, а не так, што запісала трэкі і сышла, а потым вярнулася па гатовыя песні. Мы «прапрацоўвалі» кожную ноту, і гэты працэс доўжыўся паўгода.

— Вынікам засталіся задаволены?

— Не заўсёды застаецца задаволенасць ад таго, што атрымліваеш на выхадзе. Мне, напрыклад, не падабаецца як гучыць альбом «Табе», месцамі — гучанне альбома «Пара», але збольшага я задаволена апошнім альбомам. Проста ёсць пэўныя тэхнічныя абмежаванні, і з-за іх мы не можам пакуль што дазволіць сабе «супергук». Падчас працы над музычным матэрыялам вельмі важна, каб гукарэжысёр «быў у тэме». З Анатолем мы супрацоўнічалі не раз, ён ведаў гурт, таму было прасцей.

— У наступным годзе ў вас юбілей — 10 гадоў з дня заснавання гурта. Наколькі змянілася ваша ўласнае ўспрыманне і бачанне творчасці?

— За гэты час была праведзена вялікая праца, у тым ліку і над сабой. Сапраўды ўспрыманне рэчаіснасці змянілася. І ў творчасці гурта адбыліся істотныя змены. На мой погляд, ён вырас і стаў больш ваяўнічым у падачы матэрыялу і адстойванні сваіх пазіцый. Слухаючы нашы першыя альбомы, я разумею, што ў іх — пачатак шляху, таму трэці з'яўляецца ўжо працягам яго. Прыемна, што гэта рух наперад.

— Успрыманне крытыкі ў свой адрас таксама стала іншым?

— Адносна крытыкі я «нарошчваю скуру», бо спадабацца ўсім, тым больш пры жаданні рабіць тое, што адрозніваецца ад іншых, у нейкай ступені шлях да самазнішчэння. Было балюча і крыўдна чуць у свой адрас несправядлівыя выказванні. А зараз думаю: добра, што пішуць. Я адэкватна ўспрымаю крытыку, калі яна ўказвае на недахопы ці агучвае нейкія праблемы, тэмы. Такая крытыка спрыяе развіццю і прымушае працаваць над сабой. Такія заўвагі вартыя павагі.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Ці лёгка быць лідарам

ЁСЦЬ ТАКОЕ ПРЫЗВАННЕ — ВЕСЦІ ІНШЫХ ЗА САБОЙ



Кіраўнік — гэта не пасада, а... стан душы. У гэтым пераконваешся пасля размовы са стыпендыятам ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі, студэнтам БНТУ Алегам Мацюліным. Ён — выпускнік факультэта тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі, набывае спецыяльнасць менеджара-эканаміста. Сам родам з горада Чавусы Магілёўскай вобласці. Хлопец кажа, што колькі сябе памятае, заўжды быў лідарам, займаўся грамадскай дзейнасцю. «Напэўна, на мяне паўплываў прыклад таты, які быў старшынёй калгаса, таму і мне заўжды хацелася кіраваць і накіроўваць», — прызнаецца Алег. Першакурснікам прыйшоў у прафсаюз, і ўжо на другім курсе стаў старшынёй прафбюро. «Было шмат сумневаў: ці варта ставіць старшынёй такога маладога? Але, бачыце, спраўляюся», — смяецца хлопец.

Адзін — добра, тры — лепш

Спрадвечнай праблемай, якую вырашае прафбюро, з'яўляецца засяленне ў інтэрнаты. Месцаў заўжды на ўсіх не хапае, а між іншым, колькасць студэнтаў БНТУ з кожным годам расце. Алег марыць аб будаўніцтве новага інтэрната (нават агучыў сваю прапанову на сумесным пасяджэнні калегіі Міністэрства адукацыі і Прэзідыума ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі), але ў бліжэйшы час гэта наўрад ці магчыма будзе ажыццявіць, бо значныя сродкі цяпер выдаткоўваюцца на рамонт аднаго з карпусоў універсітэта і на будаўніцтва басейна. «Але адзін інтэрнат не вырашыць праблему. Як мінімум іх патрэбна два-тры», — канстатуе хлопец.

Прафбюро займаецца не толькі засяленнем у інтэрнат, але і заахвочвае студэнтаў, выдаючы даведкі аб зніжэнні аплаты за пражыванне. «У нас на факультэце каля трыццаці чалавек атрымала такія даведкі — гэта даволі вялікі паказчык, — распавядае Алег. — Даведкі бываюць на 20% зніжкі, 40% і 60%. Каб атрымаць зніжку, студэнт павінен займацца грамадскай дзейнасцю, напісаць навуковую работу і, вядома ж, мець высокія паказчыкі ў навучанні — гэта самае важнае». Але сам Алег толькі аднойчы атрымаў зніжку на аплату. Тлумачыць гэта тым, што грамадская работа забірае шмат часу. Не ўсе выкладчыкі гэта разумеюць, некаторыя лічаць, што студэнт, у першую чаргу, павінен вучыцца.

Прафбюро займаецца не толькі засяленнем у інтэрнат, але і заахвочвае студэнтаў, выдаючы даведкі аб зніжэнні аплаты за пражыванне. Зніжкі бываюць на 20%, 40% і 60%.

За пуцёўку ў санаторый — усяго 20 тысяч

Прафбюро курыруе заезд у санаторый-прафілакторый БНТУ, што знаходзіцца на Мінскім моры. «Мы дамагліся, каб адзін раз на год студэнты маглі з'ездзіць туды амаль бясплатна, заплаціўшы ўсяго каля 20 тысяч рублёў, — з гонарам дзеліцца Алег. — Гэта за васямнаццаць дзён з чатырохразовым харчаваннем, працэдурамі і заездам на аўтобусе. Напачатку студэнты плацілі за санаторый каля 250 тысяч рублёў, але мы звярнуліся да кіраўніцтва і растлумачылі, што для маладога чалавека гэта вялікія грошы і што аздараўленне павінна быць бясплатным». Цяпер студэнт аплачвае кошт пуцёўкі (тыя самыя 250-300 тысяч), і пасля гэтыя грошы яму вяртаюць праз матэрыяльную дапамогу ад прафсаюза і ўніверсітэта. Поўны ж кошт пуцёўкі складае каля 3 мільёнаў рублёў.

Таксама ад прафсаюза студэнты могуць атрымліваць матэрыяльную дапамогу паводле некалькіх артыкулаў: у сувязі з цяжкім матэрыяльным становішчам, па стане здароўя, з нагоды ўзяцця шлюбу і нараджэння дзяцей.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

Падлікі і прагнозы

СТАЛІЧНЫЯ ШКОЛЬНІКІ ВЫБІРАЮЦЬ ВНУ

...але амаль кожны трэці выпускнік яшчэ не вызначыўся з выбарам прафесіі

Школа — гэта тое месца, куды дзіця прыводзяць за руку, а выйсці з яе ў дарослае жыццё ён павінен самастойна. Аднак ці могуць пахваліцца самастойнасцю сёлетнія выпускнікі? Ці гатовы яны да здзяйснення свядомага прафесійнага выбару? Чым кіруюцца пры выбары спецыяльнасці і месца навучання? З мэтай вывучэння прафесійных намераў адзінаццацікласнікаў Рэспубліканскі цэнтр прафарыентацыі моладзі правёў сярод выпускнікоў сталічных школ электроннае анкетаванне. Удзел у ім узялі вучні 121 сярэдняй школы, 34 гімназій і аднаго ліцэя — усяго 4355 чалавек.

— Шчыра кажучы, вынікі, якія мы атрымалі, былі прадказальныя, таму што на працягу апошніх пяці, а можа, і больш гадоў сітуацыя кардынальна не змяняецца, — расказвае **начальнік аддзела Рэспубліканскага цэнтра прафарыентацыі моладзі г. Мінска Наталля ШАЛІМА.** — Аналіз анкет паказаў, што з выбарам свайго прафесійнага шляху вызначыліся па стане на красавік толькі 73,7% выпускнікоў. На маю думку, сітуацыя, калі выпускнікі спачатку здаюць тэсты, і толькі маючы на руках сертыфікаты, вызначаюцца і са спецыяльнасцю, і з месцам навучання, — вельмі шкодзіць здзяйсненню свядомага прафесійнага выбару. Фактычна многія маладыя людзі спрабуюць «уладкаваць» свае балы.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
16 05 2013 г.

СТАЛІЧНЫЯ ШКОЛЬНІКІ ВЫБІРАЮЦЬ ВНУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Больш за тое, як расказалі нам школьныя псіхолагі, што былі задзейнічаныя ў анкетаванні, у верасні амаль усе адзінаццацікласнікі ведалі, куды яны будуць паступаць. Але першая і другая спроба рэпетыцыйнага тэсціравання вельмі азадачылі многіх. Школьнікі і іх бацькі памылкова меркавалі, што калі ў дзіцяці ў школе па прадмеце «васьмёрка» ці «дзявятка», то і на тэсціраванні яны атрымаюць прыстойную суму балаў. Аднак пасля таго, як іх спадзяванні былі разбіты ў пух і прах і адзінаццацікласнікі ўбачылі, што са сваімі баламі шанцаў паступіць туды, куды яны планавалі, няма, яны разгубіліся.

На атрыманне вышэйшай адукацыі нацэлены і выпускнікі, якія не могуць пахваліцца выдатнымі адзнакамі ў школе — яны ўпэўнены, што калі не на «бюджэт», то на платнае навучанне паступіць, хутчэй за ўсё, змогуць: балазе, колькасць месцаў у ВНУ на ўсіх формах навучання сёння перавышае колькасць выпускнікоў школ. Толькі адзін «нюанс» прымушае патэнцыяльных абітурыентаў нервавацца і разглядаць «запасныя варыянты» — павышэнне мінімальнага прахаднога бала на цэнтралізаваным тэсціраванні. Але пры паступленні ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы, як вядома, дастаткова набраць на цэнтралізаваным тэсціраванні ўсяго 1 бал, каб стаць навучэнцам.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Вышэйшая адукацыя — любой цаной

Як вынікае з анкетавання, намер паступаць у вышэйшыя навучальныя ўстановы агучылі 2816 чалавек, або 64,6% ад агульнай колькасці. У сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы збіраюцца паступаць 176 чалавек, або крыху больш за 4%. На навучанне ў прафесійна-тэхнічных навучальных установах нацэлены толькі 1,65% выпускнікоў (72 чалавекі). Прыкладна столькі ж збіраюцца шукаць сабе працу без атрымання прафесійнай адукацыі. Пра навучанне на курсах заявілі 57 чалавек, або 1,3%. А 12 чалавек не збіраюцца ні працаваць, ні вучыцца (0,28%) .

«Высокі ўзровень заработнай платы аказаўся больш сур'ёзным матывам пры выбары прафесіі для падлеткаў, чым жаданне прыносіць сваёй працай карысць»

Наўрад ці варта здзіўляцца, што ў Савецкім і Цэнтральным раёнах сталіцы, дзе сканцэнтравана найбольшая колькасць гімназій, колькасць ахвотных навучацца ў прафесійна-тэхнічных навучальных установах мінімальная — 0,6—0,7%. А ў Заводскім раёне, дзе сканцэнтраваны прамысловыя гіганты, у сістэму прафесійна-тэхнічнай адукацыі збіраюцца ісці 4,5% выпускнікоў.

Адно з пытанняў у анкеце гучала так: «Наколькі цвёрда вы вызначыліся з выбарам прафесіі?» «Буду цвёрда ажыццяўляць свой план у любым выпадку», — адказалі 77,8% рэспандэнтаў. «Калі не атрымаецца паступіць у навучальную ўстанову па абранай прафесіі, выберу іншую», — адказалі 22,8% выпускнікоў.

Пры гэтым добра ведаюць змест дзейнасці па абранай прафесіі 44,3% выпускнікоў, а 33,8 % — толькі ў агульных рысах. Каля 36% рэспандэнтаў паведамілі, што знаёмыя з прадстаўнікамі абранай прафесіі. 31,2 % заявілі, што спецыялісты абранай прафесіі запатрабаваны на рынку працы і 34,5% — што прафесія годна аплачваецца. Важнасць сваёй будучай прафесіі для грамадства ўзгадалі 28,5% адзінаццацікласнікаў.

Арыенцір — заработная плата?

— Мы цікавіліся ў школьнікаў, хто ці што паўплывала на іх выбар прафесіі. І 71% заявіў, што гэта быў іх асабісты выбар, — паведаміла Наталля Шаліма. — Парады бацькоў і сваякоў бралі пад увагу 26,7% выпускнікоў. Для 10,5% вучняў штуршком да выбару прафесіі стала захапленне любімым школьным прадметам і парады настаўніка. А вось рэкамендацыі школьнага псіхолага і сацыяльнага педагога адыгралі не большую ролю, чым парады сяброў і аднакласнікаў, — першае і другое ўзгадалі ад 5 да 6% удзельнікаў апытання.

Наяўнасць здольнасцяў пры выбары будучай прафесіі мела значэнне для 34,2% выпускнікоў. Жаданнем прадоўжыць прафесійную дзейнасць бацькоў кіраваліся 4,4% школьнікаў. Высокі ўзровень заработнай платы аказаўся больш сур'ёзным матывам пры выбары прафесіі для падлеткаў, чым, скажам, жаданне прыносіць сваёй працай карысць людзям (20% і 13,5% адпаведна). А прэстыж прафесіі ў грамадстве ўзгадалі 18% апытаных.

Ці варта здзіўляцца, што ў першых радах рэйтынгу прафесій, якія можна атрымаць у ВНУ, у сталічнай моладзі аказаліся прафесія юрыста, эканаміста (прычым згадваліся і больш вузкія спецыяльнасці, такія, як «лагістык-эканаміст», «менеджар-эканаміст», «маркетолаг-эканаміст»). З вялікім адрывам за імі ідуць прафесіі правізара, лінгвіста, журналіста, спецыяліста па міжкультурных камунікацыях, інжынера-будаўніка, трэнера, архітэктара і праграміста.

— Сумняваюся, што старшакласнікі дакладна ведаюць, што стаіць за прафесій эканаміста, бо ў школе эканоміку не вывучаюць. Таксама многія памыляюцца, калі лічаць, што добрае веданне ў школе фізікі і матэматыкі дазволіць стаць ім добрымі праграмістамі. Зусім не абавязкова. Сядзець гадзінамі ў інтэрнэце, у сацыяльных сетках, у камп'ютарных гульнях — не тое ж самае, што ствараць камп'ютарныя праграмы, — дзеліцца сваімі думкамі Наталля Шаліма. — Што нас радуе, дык гэта тая акалічнасць, што ўзначаліла рэйтынг прафесій у сталічнай моладзі ўсё ж такі прафесія ўрача.

У сістэме сярэдняй спецыяльнай адукацыі самымі папулярнымі ў моладзі аказаліся прафесія агранома, таваразнаўцы, медыцынскай сястры, фармацэўта і тэхніка-праграміста. А ў прафесійна-тэхнічных навучальных установах з вялікім адрывам лідзіруе прафесія повара.

Рэйтынг ВНУ ў сталічных школьнікаў узначаліў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (703 галасы). На другой прыступцы аказаўся Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (294 галасы), а на трэцяй — БНТУ (248). Далей галасы размеркаваліся наступным чынам: БДУІР (230), Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (198), Акадэмія МУС (115), БДТУ (114), педагагічны ўніверсітэт (113), лінгвістычны ўніверсітэт (106), універсітэт фізічнай культуры (86), Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь (56) і Акадэмія мастацтваў (54).

Сярод сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў лідарамі аказаліся два мінскія медыцынскія каледжы і аграрны каледж Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. А сярод прафесійна-тэхнічных устаноў — Мінскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж кулінарыі.

Я не паступлю? Не можа быць!

Асобнай увагі заслугоўваюць адказы выпускнікоў на пытанне у анкеце: «Калі вы не выбралі прафесію, то па якой прычыне?» 43,6% старшакласнікаў, якія не вызначыліся з выбарам, не ўпэўнены ў тым, якая спецыяльнасць ім больш падыходзіць. 36,2 % рэспандэнтаў заявілі, што выбар будзе залежаць ад адзнак у атэстаце і вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання. 42,6% школьнікаў ніяк не могуць выбраць з некалькіх прафесій, якія іх цікавяць. 9,2% дрэнна ведаюць свае здольнасці, 5,4% мала ведаюць пра прафесіі і 3,3% не ведаюць, як прафесію выбіраць. Пры гэтым больш за 60 працэнтаў старшакласнікаў лічаць, што ім дапамога псіхолага ці прафкансультанта ў выбары прафесіі не патрабуецца. Прыкладна 10 працэнтаў канстатавалі, што такая дапамога ім патрэбна і яны ведаюць, дзе яе можна атрымаць, і такая ж колькасць не ведае, хто і дзе можа дапамагчы ім у выбары прафесіі.

Аўтараў даследавання цікавіла таксама, што будуць рабіць выпускнікі, калі не паступяць туды, куды планавалі. І высветлілася, што да такога развіцця падзей многія не падрыхтаваны. Амаль кожны трэці не змог даць адказ на гэтае пытанне. 11% паведамілі, што паступяць на падрыхтоўчае аддзяленне і 23% — на падрыхтоўчыя курсы, каб падрыхтавацца да паступлення на наступны год. 9,7% будуць рыхтавацца да паступлення самастойна. 7,6% заявілі, што пойдуць на курсы для атрымання спецыяльнасці і далейшага працаўладкавання і 21% — пойдзе працаваць. Між іншым, варыянт з завочнай формай атрымання адукацыі (паралельна з работай) мала хто разглядае.

«36,2% рэспандэнтаў заявілі, што выбар прафесіі будзе залежаць ад адзнак у атэстаце і вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання»

Трэба дадаць, што на думку псіхолагаў, для сучаснай моладзі характэрная завышаная самаацэнка, калі ўзровень іх прэтэнзій не адпавядае таму, кім з'яўляецца насамрэч малады чалавек. Разам з тым, многія старшакласнікі элементарна баяцца будучыні і сваім паступленнем у ВНУ спрабуюць прадоўжыць сабе бесклапотнае жыццё яшчэ на чатыры—пяць гадоў. Аднак жа адукацыйную траекторыю можна будаваць і іншым чынам: спачатку атрымаць рабочую спецыяльнасць, а затым ужо сярэднюю спецыяльную або вышэйшую адукацыю (калі ў гэтым і сапраўды будзе патрэба).

— Я ўпэўнена, што цалкам рэалізаваць свой патэнцыял, быць запатрабаваным на рынку працы і пазбегнуць расчаравання можна толькі пры ўмове правільнага выбару прафесіі, — падкрэслівае Наталля Шаліма. — Займацца любімай справай — шчасце, якога можа дасягнуць. А для гэтага трэба ведаць свае здольнасці, прафесійныя інтарэсы, схільнасці, а таксама улічваць патрабаванні прафесіі да чалавека і сітуацыю на рынку працы.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Абітурыент—2013

Алімпіяды, якія адкрываюць дарогу

У 2013 годзе права быць залічанымі без здачы ўступных іспытаў у вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы будуць мець пераможцы 10 міжнародных алімпіяд. Днямі Міністэрства адукацыі вызначылася з іх пералікам.

Без здачы цэнтралізаванага тэсціравання змогуць паступаць абітурыенты, якія атрымалі дыпломы I, II і III ступені на сёмай міжнароднай алімпіядзе па астраноміі і астрафізіцы (Грэцыя), сёмай алімпіядзе школьнікаў Саюзнай дзяржавы па рускай мове і літаратуры «Расія і Беларусь: гістарычнае і духоўнае адзінства», 24-й міжнароднай біялагічнай алімпіядзе (Швейцарыя), 25-й міжнароднай алімпіядзе па інфарматыцы (Аўстралія), 44-й міжнароднай фізічнай алімпіядзе (Данія), 45-й міжнароднай хімічнай алімпіядзе (Расія), 47-й міжнароднай Мендзялееўскай алімпіядзе школьнікаў па хіміі (Узбекістан), 54-й міжнароднай матэматычнай алімпіядзе (Калумбія), 10-й міжнароднай геаграфічнай алімпіядзе (Японія) і другой еўрапейскай матэматычнай алімпіядзе сярод дзяўчат (Люксембург).

Класныя навіны

Выпускнікі будуць гуляць да ўсходу сонца

Камітэт па адукацыі Мінгарвыканкама вызначыўся з днём правядзення выпускных вечароў: мерапрыемствы, прысвечаныя ўручэнню атэстатаў аб агульнай сярэдняй адукацыі, пройдуць у сталічных школах 11 чэрвеня. Традыцыйна ва ўрачыстасцях возьмуць удзел прадстаўнікі органаў заканадаўчай і выканаўчай улады, грамадскіх аб'яднанняў, сферы культуры і спорту і арганізацый-шэфаў.

Пачатак урачыстасцяў ва ўсіх установах адукацыі прызначаны на 19 гадзін. **А вось час заканчэння святочных мерапрыемстваў будзе ўзгадняецца з кіраўніцтвам раённых адміністрацый (арыенціровачна гэта 4-6 гадзін раніцы).**

Праводзіць выпускныя вечары за сценамі агульнаадукацыйных устаноў дазваляецца толькі ў асобных выпадках (калі ва ўстанове адукацыі адсутнічаюць адпаведныя умовы), але пад гэтыя мэты дазваляецца выкарыстоўваць толькі ўстановы пазашкольнага выхавання і навучання і ўстановы культуры.

Навучальны год для вучняў 1-8-х і 10-х класаў завяршыцца 31 мая. Апошні званок для вучняў 9-х і 11-х класаў прагучыць 30 мая. Завяршаюць навучанне на ўзроўні базавай школы ў бягучым годзе больш як 13,3 тысячы чалавек, на ўзроўні сярэдняй школы — 8,9 тысячы навучэнцаў, што трохі менш у параўнанні з мінулым годам.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Любімая справа

КАЛІ ПРАЦА — ЯК «МАННА НЯБЕСНАЯ»

Ёсць людзі, якія захапляюцца дарагімі аўтамабілямі ці тэхнікай, а нехта не ўяўляе свайго жыцця без футбола... Мой суразмоўца ўжо тры гады прысвяціў вывучэнню — чаго б вы думалі? — беларускай ліхенафлоры (флоры лішайнікаў). І калі толькі пра іх заходзіць размова, у яго голасе чуецца запал і імпэт. Павел Белы зацікавіўся гэтымі не для ўсіх заўважнымі арганізмамі яшчэ падчас сваёй вучобы на біяфаку ў Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце. Пасля пачаў іх вывучаць, а ў выніку стаў стыпендыятам Прэзідэнцкага фонду па падтрымцы таленавітай моладзі.

Размеркаванне — у радасць

На малодшых курсах лішайнікі зацікавілі Паўла тым, што ў Беларусі яны мала даследаваны. «*Па-першае, гэта не зусім зразумелы арганізм сам па сабе ў тым плане, што ён уяўляе сабой сімбіёз водарасцяў і грыбоў,* — распавядае малады навуковец. — *Па-другое, падчас вучобы лішайнікам было прысвечана ўсяго толькі некалькі заняткаў*.

У студэнцкія гады хлопец звяртаў на навуку мала ўвагі. «*За ўвесь час навучання ў мяне была толькі адна апублікаваная работа,* — прызнаецца ён. — *Ды і тое не па лішайніках, а па кармавых раслінах*». Пасля ўніверсітэта Паўла, як і іншых спецыялістаў бюджэтнай формы навучання, чакала размеркаванне. Хутчэй за ўсё, першым працоўным месцам павінна была стаць школа. Але хлопец трапіў у Бярэзінскі біясферны запаведнік.

— *Прырода там вельмі цікавая і па-свойму ўнікальная,* — не ўтойвае свайго захаплення мой суразмоўца. — *Такім чынам, запаведнік стаў вельмі добрым «палігонам» для назапашвання вопыту, а таксама канкрэтных матэрыялаў па ліхенафлоры. Дарэчы, сёння ў Беларусі (гэта, натуральна, прыблізныя ацэнкі) існуе больш за пяцьсот відаў лішайнікаў.*

Менавіта ў запаведніку ў Паўла абудзіўся сапраўдны навуковы інтарэс да тэмы сваёй будучай дысертацыі.

За кожны пянёк не зазірнеш...

Да яго лішайнікі ў Беларусі даследаваліся, але не так сістэматычна. Між іншым, гэтыя арганізмы могуць стаць карыснымі для ацэнкі ўплыву тэхнагеннага забруджвання на лясы. Павел пачаў вывучаць стан ліхенафлоры ельнікаў. Чаму менавіта лішайнікі з'яўляюцца паказчыкам таго, наколькі моцна ўздзейнічае чалавек на прыроду? Ды таму, што гэтыя арганізмы ўяўляюць сабой найменш абароненыя складнікі лясных экасістэм. Ужо па распаўсюджанасці або адсутнасці асобных іх відаў у лесе можна зрабіць высновы наконт узроўню забруджанасці ў гэтым месцы. Зноў жа, лішайнікі ў стане назапашваць пэўныя хімічныя элементы, якіх шмат у канкрэтным месцы. Гэта таксама дапамагае пры аналізе ўплыву тэхнагеннага забруджвання на прыроду.

Дарэчы, дзякуючы намаганням маладога навукоўца, у Цэнтральным батанічным садзе створаны гербарый, у які ўваходзіць каля 180 экзэмпляраў гэтых арганізмаў: ад самых звычайных да вельмі рэдкіх відаў.

Што немалаважна, матэрыялы яго даследавання будуць выкарыстаны пры падрыхтоўцы наступнай рэдакцыі Чырвонай кнігі Рэспублікі Беларусь, запланаванай на 2015 год: у прыватнасці, гэта інфармацыя пра месцы, дзе растуць рэдкія віды лішайнікаў, а таксама звесткі пра віды, якія да цяперашняга часу лічыліся зніклымі з тэрыторыі Беларусі.

Павел расказвае, што падчас экспедыцый знаходзіліся новыя віды лішайнікаў, якіх дагэтуль у нашых шыротах не было. У той жа час высветлілася, што некаторыя, наадварот, зніклі. А хіба ў чалавечых сілах аб'ездзіць усе беларускія лясы і прагледзець усе ствалы дрэў, камяні, пянькі, дзе могуць «хавацца» новыя ці даўно забытыя «старыя» віды? Вось і атрымліваецца, што іх колькасць на тэрыторыі нашай краіны мы ведаем толькі прыблізна.

У чым карысць лішайнікаў?

З іх дапамогай навукоўцы могуць зрабіць высновы пра экалагічны стан лесу. Яны служаць таксама ежай для жывёл, з гэтых арганізмаў людзі з даўніх часоў рабілі лекі. Ці былі яны дзейснымі тады — дакладна невядома. Але зараз пэўныя віды лішайнікаў служаць матэрыялам для атрымання антыбіётыкаў.

Зноў жа, з лішайнікаў робяць розныя фарбавальнікі: пунсовы, сіні, карычневы і жоўты. Некаторыя іх віды прыдатныя для ўжывання ў ежу. Ёсць нават версія, што вядомая па біблейскіх міфах манна нябесная была адным з відаў лішайнікаў. Плямёны, якія жывуць у пустыні, і зараз выкарыстоўваюць іх у ежу.

А вольны час — «па-гарадскому»

Зараз Павел працуе малодшым навуковым супрацоўнікам Цэнтральнага батанічнага саду Нацыянальнай акадэміі навук. Так атрымалася, што я трошкі спазнілася на сустрэчу, бо пераблытала ўваходы, таму майму суразмоўцу давялося мяне сустракаць. Дык вось, пакуль мы ішлі да будынка, дзе размяшчаецца яго кабінет, я нават пазайздросціла такому месцу працы. Недалёка ад цэнтра горада, а побач — унікальны лес-сад. Але аказалася, што ў хлопца няма часу, каб гуляць тут, бо занадта шмат працы.

На маё пытанне, ці часта ён выязджае на прыроду не дзеля «вытворчай» неабходнасці, а так, для душы, Павел адказаў, што даволі рэдка:

— *Атрымліваецца, што для сябе ўжо шукаеш больш гарадскія забавы: схадзіць у кіно, цырк, тэатр. Выехаць у лес не выпадае. Хіба што калі наведваю бацькоў, дык з задавальненнем іду ў лес. Праўда і не толькі, каб адпачыць, але і каб дапоўніць сваё даследаванне.*

Кажуць, што трэба займацца тым, што цікава, што любіш рабіць. Тады пры любым раскладзе праца не будзе цябе напружваць. Напэўна, гэтае сцвярджэнне цалкам можна аднесці і да малодшага навуковага супрацоўніка Паўла Белага.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

ЁСЦЬ ТАКОЕ ПРЫЗВАННЕ — ВЕСЦІ ІНШЫХ ЗА САБОЙ

Школа жыццёвай загартоўкі

Як старшыня прафбюро, Алег займаецца арганізацыяй самых розных мерапрыемстваў на факультэце: футбольныя матчы, канцэрты, гульні, акцыі, спаборніцтвы... Летась напісаў праект конкурсу на лепшы пакой інтэрната. Конкурс праводзіўся сярод усіх інтэрнатаў БНТУ, а яго пераможца атрымаў ад універсітэта ў карыстанне на пяць гадоў халадзільнік «Атлант».

Хлопец кажа, што займацца арганізацыйнымі справамі даволі складана таму, што трэба не толькі раздаць заданні, але і кожнага пракантраляваць, нешта падказаць. «Хтосьці хоча займацца грамадскай дзейнасцю, хтосьці — не. Некаторыя кажуць, што прыйшлі сюды, каб вучыцца. Але з часам гэтыя студэнты самі пачынаюць праяўляць ініцыятыву, каб потым было што ўзгадаць з універсітэцкага жыцця. Чамусьці некаторыя ўспрымаюць прафсаюз як нешта недарэчнае, — абураецца Алег. — Але гэта глупства! Уступіць у прафсаюз можа любы, як і сысці адтуль. Ніхто нікога не трымае гвалтам. Але калі чалавек бярэ непасрэдны ўдзел у жыцці прафсаюза, гэта яго загартоўвае. А колькі з'яўляецца новых знаёмых! І гэта насамрэч прыемна, калі прыходзіш ва ўніверсітэт і рука ўжо баліць з усімі вітацца.

Спакой толькі... сніцца

Алег прызнаецца, што работа старшыні — вельмі адказная. «Трэба шмат чаго ведаць, каб дапамагаць іншым. Я лічу, ніколі не трэба здавацца, і заўжды верыць у тое, што робіш», — выказвае сваю жыццёвую пазіцыю малады лідар.

Цяпер хлопец амаль цалкам заняты прафсаюзнай работай і вучобай, таму часу на нейкія захапленні амаль не застаецца. Асноўным сваім хобі, смеючыся, называе сон. І ўсё ж Алег стараецца сачыць за сабой, таму займаецца спортам — бегае, наведвае трэнажорную залу.

«Бывае, я стамляюся і прашу, каб мяне некалькі тыдняў не турбавалі, каб я мог адпачыць і падцягнуць вучобу. Але мяне хапае на тыдзень такога «спакойнага» жыцця. А далей становіцца сумна. Звычка ёсць звычка».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Прафбюро курыруе заезд у санаторый-прафілакторый БНТУ, што знаходзіцца на Мінскім моры. «Мы дасягнулі таго, каб адзін раз на год студэнты маглі з'ездзіць туды амаль бясплатна, заплаціўшы ўсяго каля 20 тысяч рублёў», — з гонарам дзеліцца Алег.

Знайсці пераемніка няпроста

Адміністрацыя ўніверсітэта не хоча, каб Алег сыходзіў з пасады старшыні прафбюро. І не дзіўна: актывіст, стыпендыят, уладальнік статусу прафсаюзнага лідара па выніках 2012 года — ідэальны партрэт кіраўніка арганізацыі. Але вучоба заканчваецца, і малады чалавек ужо рыхтуе сабе замену. Як высветлілася, нават да гэтай справы ў Алега своеасаблівы падыход. «У нас факультэт гуманітарны і складаецца ў большасці з дзяўчат, таму я наўмысна паставіў сабе задачу знайсці пераемніка-хлопца, — дзеліцца ён сваім псіхалагічным досведам. — Бо жаночы калектыў больш прыслухоўваецца да кіраўніка-мужчыны». На думку Алега, кіраўніком павінен быць мужчына, а дзяўчына — яго намеснікам. Тады атрымліваецца гарманічнае і ўзаемадапаўняльнае кіраўніцтва: дзяўчына надае шмат увагі дробязям, а хлопец бачыць праблемы глабальна.

Знізу — уверх

Пасля заканчэння вучобы Алег плануе застацца ў Мінску і зараз займаецца пошукам працы па спецыяльнасці. Кажа, што трэба пачаць з малога, каб атрымаць досвед і паступова рухацца па кар'ернай лесвіцы. «Трэба спачатку адчуць усё на сабе, перад тым як патрабаваць ад іншых. А калі ты проста б'еш кулаком па стале і кажаш «Мне трэба!» — то які з цябе кіраўнік? Як я стаў старшынёй прафбюро? Спачатку быў намеснікам, але да гэтага паспеў папрацаваць на ўсіх пасадах у арганізацыі. Таму, нават маючы досвед у кіраўніцтве, нельга адразу ісці на высокія пасады, не папрацаваўшы простым менеджарам ці эканамістам».

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

Даеш знаходкі!

Кафля з райскай птушкай

Студэнцкі атрад, які працуе на археалагічных раскопках Быхаўскага замка, зрабіў першыя знаходкі.

Моладзевай будоўляй 2013 года аб'яўлены ў Магілёўскай вобласці старажытны Быхаўскі замак. Ён аднаўляецца і прыводзіцца ў парадак да сёлетняга Дня пісьменства, і актыўны ўдзел у гэтым бяруць студэнты кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Куляшова.

Трыццаць маладых людзей аб'ядналіся ў атрад, які носіць імя першага загадчыка кафедры, вядомага археолага Вячаслава Капыціна. Студэнтамі на быхаўскіх раскопках кіруе цяперашні загадчык кафедры, доктар гістарычных навук, прафесар Ігар Марзалюк.

— Мы інтэнсіўна працуем у Быхаве 3-4 дні на тыдзень, але колькасць удзельнікаў атрада будзем павялічваць, бо працы шмат, — каментуе Ігар Марзалюк. — Мы цяпер занятыя ў дзвюх замкавых вежах, раскопваем браму на ўездзе. Але ёсць рашэнне таксама сёлета працаваць яшчэ на адным помніку архітэктуры ў Быхаве — гэта ўнікальная сінагога, якую цяпер плануюць не проста закансерваваць, але і пакрыць дахам.

Пакуль жа студэнцкі атрад засяродзіўся на тэрыторыі Быхаўскага замка. Адна з яго вежаў у савецкі час выкарыстоўвалася як воданапорная, а вось у іншай удалося расчысціць аўтэнтычную падлогу XVII стагоддзя. Сярод першых знаходак — кафля з выявай райскай птушкі, старажытныя манеты і ядры часоў Паўночнай вайны, калі расійскія войскі штурмавалі Быхаў.

— Гэта яшчэ толькі пачатак, — упэўнены Ігар Марзалюк. — У нас тут вялізныя раскопкі: 20 на 24 метры, працы зашмат. Усе самыя цікавыя знаходкі яшчэ наперадзе.

Ілона ІВАНОВА.

ЧАКАЮЦЦА «КЛІМАТЫЧНЫЯ БАТАЛІІ»

Цэнтр экалагічных рашэнняў запрашае школьнікаў прыняць удзел у «кліматычнай» віктарыне, прымеркаванай да Міжнароднага дня клімату.

Пытанні віктарыны будуць размешчаны на сайце www.ecoidea.by 17 мая з 15 да 17 гадзін. Для адказаў на іх можна выкарыстоўваць самыя розныя крыніцы інфармацыі: падручнікі, дапаможнікі, інтэрнэт і г. д. Адказы будуць уносіцца ў спецыяльную форму, якая таксама будзе прадстаўлена на сайце. Каманда можа складацца з любой колькасці чалавек. А пераможцам стане тая, якая дасць максімальную колькасць правільных адказаў за час правядзення анлайн-гульні. Пераможца будзе аб'яўлены ў пачатку чэрвеня.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
16 05 2013 г.

Мелодыі падземных пераходаў

ВУЛІЧНЫЯ МУЗЫКАНТЫ І ІХ СЛУХАЧЫ: балансаванне на мяжы густаў

У многіх краінах свету вулічныя музыканты з'яўляюцца часткай гарадской культуры. У нас гэтая з'ява пакуль не настолькі распаўсюджаная, як, напрыклад, у Еўропе, але час ад часу такіх выканаўцаў сустрэць можна.

Уласнае «я» і ўплыў куміра

Улад Казачонак — студэнт першага курса БДУ, вучыцца на менеджара-эканаміста. Тым не менш жыццё ён хоча звязаць з музыкай, якой «жыве».

Сёлета Улад сабраў свой гурт «ForAboutFrom», які зараз актыўна развіваецца. Жаданне распавесці людзям пра сваю творчасць і стала адной з прычын, па якіх Улад з год таму пачаў іграць на гітары ў пераходзе метро. Што цікава, у хлопца няма музычнай адукацыі і грае ён усяго тры гады, а яго настаўнікам па гітары ў свой час быў YouTube.

«Вядома, прысутнічае і грашовы бок, — кажа Улад. — Я студэнт, у мяне не надта шмат грошай, а так я магу займацца любімай справай і адначасова зарабляць на гэтым».

Малады музыкант прызнаецца, што таксама на яго паўплываў прыклад расійскага выканаўцы Noize MC: «Нягледзячы на тое, што гэта ўжо сапраўдная «зорка», ён працягвае іграць на Арбаце».

Грошы — на песнях пра вайну

У выбары рэпертуару Улад імкнецца да кампрамісу. Яго ўласная музыка — гітарны рэп — больш падабаецца моладзі, чым людзям старэйшага ўзросту. Песні яшчэ малавядомыя, таму, калі ёсць патрэба зарабіць грошы, музыкант пераходзіць на песні пра вайну, якія падабаюцца публіцы.

«Звычайна я змешваю рэпертуар: іграю пяць песень сваіх, дзве — «на грошы», — раскрывае выканаўца сакрэты вулічна-музычнага маркетынгу.

А ўвогуле пытанне заробку залежыць ад шматлікіх складнікаў: што ты іграеш, дзе, у які час. За пятнаццаць — дваццаць хвілін (больш на адным месцы хлопец не затрымліваецца) можна зарабіць тысяч трыццаць — сорак. Але лічба гэтая нестабільная: у гадзіну пік можна зарабіць у два разы больш, а часам — і нічога не атрымаць.

«Наш рэкорд — мы ігралі з хлопцамі з групы — сто тысяч за паўгадзіны. Нам проста трапіўся вясёлы дзядзька нападпітку, які пачаў танцаваць пад нашу музыку і паклаў нам адразу пяцьдзясят тысяч».

Па словах Улада, за дзень, калі іграць доўга, можна выручыць каля двухсот тысяч. Але, на думку музыканта, гэта не так шмат.

«Я жыву дома, мяне кормяць, таму магу зарабляць на нейкія асабістыя расходы. А тыя студэнты, што жывуць у інтэрнатах, наўрад ці змогуць пражыць на заробак ад вулічных выступленняў».

Казусы «рамяства»

Бывае, што падчас вулічных канцэртаў можна трапіць і ў непрыемныя, недарэчныя ці смешныя гісторыі.

«Мы ігралі ў пераходзе на станцыі метро «Аўтазаводская», — узгадвае Улад. — Да нас падышла «банда» чалавек з дзесяці, з голымі торсамі, паголенымі галовамі, у наколках. Мне неяк ужо расхацелася спяваць. Але яны пастаялі, пераключыліся парай слоў і пайшлі. Праз нейкі час вяртаюцца, ставяць нам два літры піва і кажуць: «Хлопцы, мы вас паважаем, мы вашы фанаты!» У выніку яны запрасілі нас некуды выступіць, але мы адмовіліся, бо страшнавата. Аднойчы да нас падышоў мужчына сталага веку і сказаў: «Хлопцы, вы малайцы, я ў маладосці таксама такім займаўся, толькі мы грукалі па каробках...» Ён папрасіў у мяне гітару і сыграў Высоцкага. За адну песню яму далі тысяч дваццаць».

Слухач і салідарнасць па «цэху»

Да вулічных музыкантаў у грамадстве стаўленне неадназначнае, але Улад кажа, што людзі рэагуюць на іх выступленні пераважна станоўча.

«З капелюшом да людзей мы не кідаемся. Я лічу, што гэта няправільна, выглядае як папрашайніцтва. Мы даем свабоду выбару: вы можаце нам аддзячыць за ігру грашыма, а можаце не аддзячыць».

Стаўленне з боку міліцыі да вулічных музыкантаў таксама рознае. Мой суразмоўца кажа, што канфліктных сітуацый з праваахоўнымі органамі ў яго ніколі не ўзнікала. Калі міліцыянеры просяць «пакінуць сцэну», то культурна.

Пра «канкурэнцыю» і «падзел тэрыторыі» паміж вулічнымі музыкантамі Улад ведае толькі па чутках. Затое адзначае, што ёсць «прафесійная» салідарнасць паміж выканаўцамі.

«Аднойчы я іграў, да мяне падышоў чалавек і паклаў грошы. Я не ведаю яго, проста запомніў. Потым я неяк ішоў і пабачыў, што іграе той самы чалавек, і таксама паклаў яму грошы. Мы ўжо даволі часта з ім сустракаліся, але так і не загаварылі пакуль. А ўвогуле, заўжды, калі бачу вулічных музыкантаў, стараюся ім аддзячыць грашыма».

«Хацелася б ацэнкі ўзроўню»

Газета «Вашынгтон пост» правяла цікавы эксперымент: адзін з лепшых сусветных музыкантаў Джошуа Бэл у гадзіну пік цягам сарака пяці хвілін выконваў складанейшыя творы на скрыпцы Страдывары ў вашынгтонскім метро. За гэты час толькі шэсць чалавек ненадоўга спыніліся і паслухалі музыку, яшчэ дваццаць, не спыняючыся, кінулі музыканту грошы. Заробак сусветна вядомага скрыпача, якога так ніхто і не пазнаў, склаў $32.

У мінскім метро наўрад ці сустрэнеш «зорку». Хіба толькі аднойчы ў пераходзе з гітарай «засвяціўся» Саладуха — у якасці розыгрышу. Затое часта беларускія музыканты едуць даваць вулічныя канцэрты за мяжу.

Андрэй Кунцэвіч працуе настаўнікам у мінскай сярэдняй школе № 133. Акрамя таго, з'яўляецца старшым выкладчыкам кафедры харавога дырыжыравання Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. У свой час Андрэю Аляксеевічу давялося прымерыць на сябе ролю вулічнага спевака, толькі ў Германіі, бо ў Беларусі тады цяжка было знайсці працу.

«Там да гэтага людзі ставяцца па-іншаму: не падаюць міласціну, а ацэньваюць прафесійны ўзровень выканаўцы, — адзначае Андрэй Кунцэвіч. — Узровень нашай культуры, на жаль, пакуль не такі высокі».

Яно і не дзіўна, бо, па словах Андрэя Аляксеевіча, у сённяшніх школьнікаў прыбралі з праграмы шматлікія прадметы, неабходныя для выхавання культурнай асобы: няма сусветнай мастацкай культуры, музыка выкладаецца толькі да чацвёртага класа, і часам настаўнікамі з'яўляюцца тыя, хто сам ёй на належным узроўні не займаўся.

А што кажа закон?

Прэс-сакратар ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Ластоўскі растлумачыў:

— У Адміністрацыйным кодэксе няма артыкула, які б забараняў выступленні вулічных музыкантаў. Але ўсё залежыць ад канкрэтнай сітуацыі, таму агульны вердыкт вынесці складана. Уплываюць шмат абставін: іграе музычны калектыў ці аматар-адзіночка, з'яўляецца гэта канцэртнай дзейнасцю ці не. Калі музыканты іграюць за грошы, такая дзейнасць павінна быць неяк ліцэнзавана, але гэта ўжо пытанне да падатковай інспекцыі. Калі яны не парушаюць грамадскі парадак і іх паводзіны не супрацьпраўныя, калі няма абразлівых паводзін і прыстаўання да грамадзян, то прэтэнзій з боку закона да іх быць не павінна.

Таксама важна, дзе выступаюць музыканты. Аляксандр Ластоўскі адзначыў, што ігра ў падземным пераходзе (гэта значыць, у замкнёнай абмежаванай прасторы) можа выклікаць цісканіну. У згаданым выпадку на выступоўцаў распаўсюджваюцца правілы паводзін у метрапалітэне.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

ВЕЛЬМІ ДАРЭЧЫ!

Калі матэрыял ужо быў падрыхтаваны да друку, мы даведаліся, што Улад Казачонак удзельнічаў са сваім гуртом «ForAboutFrom» у рэспубліканскім конкурсу моладзевых рок-выканаўцаў Rock Junior. Хлопцы атрымалі перамогу ў конкурсе, прычым адразу ў трох намінацыях: «Лепшая рок-група 2013 года», «Лепшая кампазіцыя» і «Лепшы басіст». У складзе журы конкурса былі Уладзімір Пугач (J:Морс), Алег Хаменка («Палац»), Аляксандр Сапега (ex Apple Tea), Аляксандр Старажук (ex Apple Tea, ex «Ляпіс Трубяцкой»), Уладзімір Угольнік, Уладзімір Бялоў, Пётр Ялфімаў.

«МОЖНА СМЕЛА СКАЗАЦЬ: Я — «ЗАДАВОЛЕНА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Неаднойчы вам даводзілася выступаць з многімі знакамітымі калегамі. Якія ўражанні засталіся?

— Існуе пэўная ілюзія, што людзі, чыя творчасць табе падабаецца — гэта некія «жыхары неба». Маючы нагоду пазнаёміцца з артыстамі, творчасць якім мне блізкая і цікавая, я зразумела: яны звычайныя людзі. І характарызаваць з пазіцыі «жыхар неба» іх складана, бо ты бачыш, як яны працуюць над сабой, якое ў іх імкненне прасоўвацца ў творчасці і заставацца запатрабаванымі. У мяне ёсць дакладнае разуменне, што ніхто нічога не будзе рабіць за цябе. Цябе могуць падтрымліваць, раіць нешта, але прайсці свой шлях давядзецца самому. Паколькі гурт першапачаткова стварае некамерцыйную музыку, то нашы мэты — самавыяўленне і ажыўленне, калі можна так сказаць, людзей, бо мы зараз жывём у свеце, дзе неабавязкова думаць і адчуваць. І таму я, як стваральніца гурта, разумею, што памылкі і спробы, якія мы робім на сваім шляху, не маюць аналагаў.

— Рок-музыка ва ўсе часы дае магчымасць выказвацца на злобу дня...

— Менавіта гэтым і адрозніваецца рок-музыка. Бо яна, з-за глыбіні таленту лідара, адлюстроўвае ўсё, што адбываецца з намі як звонку, так і ўнутры.

— А ўзрост артыста мае значэнне?

— Пачынаць можна калі заўгодна, але да глыбокага светаадчування прыходзіш усё ж такі з узростам. Шлях станаўлення ва ўсіх розны, галоўнае — вынік, і тут важна слухаць сваё сэрца і розум.

— Вы паспяхова рэалізуеце сябе ў амплуа не толькі спявачкі, але і актрысы. Тэатр і музыка заўсёды былі для вас аднолькавымі прыярытэтамі?

— Я ніколі не магла расставіць прыярытэты паміж сям'ёй, музыкай і тэатрам. Адсутнасць аднаго з гэтых кампанентаў зробіць мяне негарманічнай і няшчаснай. Дзякаваць Богу, мне хапае часу і сіл на ўсё. Было б больш цяжка, калі б нешта адсутнічала ў маім жыцці.

— Пасля нараджэння дзяцей ваша ўспрыманне працы змянілася?

— Вельмі моцна. Нішто на мяне не паўплывала так, як нараджэнне дзяцей. І я заўсёды кажу, што нарадзіць дзіця — самая вялікая патрэба, бо цалкам змяняецца свет. Усё пераацэньваеш, бо адказнасць, якая кладзецца на твае плечы, прымушае перагледзець многія рэчы, нават тое, як ты дыхаеш і адчуваеш.

У мяне ёсць дакладнае разуменне, што ніхто нічога не будзе рабіць за цябе. Цябе могуць падтрымліваць, раіць нешта, але прайсці свой шлях давядзецца самому.

— Як выхоўваеце дзяцей?

— Я не магу быць з імі строгай, бо вельмі моцна іх люблю. Стараюся неяк сістэматызаваць працэс выхавання, аднак мая жыццёвая пазіцыя (не ведаю, ці будзе яна мець поспех у будучыні) такая, што дзеці павінны расці ў атмасферы вялікай любові. Нішто іншае не здольнае лепш сфарміраваць іх характар. Часта прыгадваеш, як выхоўвалі цябе і якой была твая рэакцыя, імкнешся пазбегнуць нейкіх памылак. Для сваіх дзяцей хочацца лепшага жыцця.

— Якой бы моцнай і таленавітай жанчына ні была, важна, каб побач было мужчынскае плячо?

— Я не думаю, што зрабіла б і палову таго, што ёсць, калі б не падтрымка майго мужа. Мы абое творчыя і эмацыянальныя людзі, таму нельга сказаць, што ўсё заўсёды ідэальна. Але я ведаю і адчуваю: у мяне ёсць «мой» чалавек, які заўсёды на маім баку, і гэта многа дае.

— Шукалі яго доўга? І як зразумелі, што чалавек «ваш»?

— Мы сустрэліся на адным з першых канцэртаў гурта. І неяк адразу адно аднаго адчулі. Вельмі многае спрацоўвае, апроч таго, што разумееш: табе проста добра з ім. Потым праз нейкі час, калі разам пражываеце нейкія падзеі, не заўсёды радасныя, але застаяцеся разам, прыходзіць разуменне: вы створаны адно для аднаго.

— Атрымліваецца, уменне заставацца адной камандай па жыцці і ёсць сакрэт моцнай сям'і?

— Залог у тым, што вы адчуваеце тыл у асобе адно аднаго. Акрамя гэтага, ёсць гармонія фізічная і эмацыянальная ў суіснаванні. Людзі ж, па сутнасці, адзінокія, бо прыходзяць у жыццё і сыходзяць з яго па адным. Але жанчына і мужчына разам даюць паўнавартасны і гарманічны саюз, дзе ёсць адчуванне цэласнасці. Патрабуецца вялікая праца, накіраваная адно на аднаго. Калі яна ёсць, то гэта сапраўдная сям'я.

Алена ДРАПКО.

Конкурс «Новы погляд»

ЧАКАЕМ ПАДВЯДЗЕННЯ ВЫНІКАЎ!

Конкурс «Новы погляд», згодна з абвешчанымі восенню мінулага года ўмовамі, скончаны. Лепшыя творчыя працы юных і маладых карэспандэнтаў, якія цягам гэтых месяцаў яны дасылалі ў рэдакцыю, рэгулярна з'яўляліся на старонках «Чырвонкі». Мы прымалі іх да 1 мая ўключна (па даце адпраўкі). І ўжо рыхтаваліся падводзіць вынікі конкурсу, як...

Відавочна, па добра вядомай школьнай і студэнцкай звычцы рабіць усё ў апошні момант (напярэдадні кантрольнай, заліку ці экзамену), нашы новыя аўтары літаральна гэтак жа — напрыканцы заканчэння тэрміну прыёму матэрыялаў — закідалі рэдакцыю сваімі нататкамі з пазнакай «на конкурс «Новы погляд»! Сярод гэтых прац ёсць вартыя творчыя матэрыялы. Таму падвядзенне вынікаў... адкладваецца. Прынамсі, на бліжэйшы час, пакуль рэдакцыя «Чырвонкі» не надрукуе лепшыя (як было і дагэтуль) з дасланых на конкурс работ. Таму ўважліва сочым за наступнымі выпускамі газеты!

І яшчэ. Нягледзячы на тое, што гэты конкурс ужо скончаны, а чарговы яшчэ не абвешчаны, мы заклікаем нашых юных аўтараў: пішыце, дасылайце ў рэдакцыю свае «пробы пяра»! Наперадзе — лета, якое дае магчымасць не толькі перажыць цудоўныя моманты ў жыцці, але і падзяліцца імі са старонак «Чырвонкі» з іншымі! Чакаем новых допісаў!

Рэдакцыя «Чырвонкі».

ГЭТА — ГАЛОЎНАЕ

МЫ Ж — БЕЛАРУСЫ!..

Хто такія беларусы? Што гэта за краіна, дзе яны жывуць? Напэўна, такія пытанні задае сабе кожны чалавек, які першы раз ступіў на нашу святую зямлю.

Беларусы — людзі добразычлівыя і добрасумленныя. Яны да ўсіх ставяцца з павагай. Гэты народ асабліва вядомы і сваёй працавітасцю, гасціннасцю і талерантнасцю. У сваю працу беларусы заўсёды ўкладваюць часцінку душы. Вось чаму ў Беларусі самы смачны хлеб! Ахвотна запрашаючы дарагіх гасцей у свой дом, беларус скажа: «Госць у доме — Бог у доме».

Свабодалюбства... Менавіта яно з'яўляецца адной з галоўных рыс беларускага характару. Шмат гадоў у розных сутыкненнях і войнах беларусы мужна абаранялі сваю краіну. Кожны трэці аддаў сваё жыццё на Вялікай Айчыннай вайне — дзеля сваёй сям'і, свайго народа, сваёй Бацькаўшчыны. Любоў да Радзімы саграваля сэрцы беларусаў і не дазваляла скарыцца нават у самыя цяжкія хвіліны, тады, калі боль быў нясцерпным. Гэта сапраўдны гераізм, і гісторыя памятае шмат прыкладаў патрыятызму. Адна назва — Брэсцкая крэпасць — сама па сабе гаворыць нам аб сіле духу, самаадданасці, смеласці і адважнасці беларускага народа.

Беларусы — мірныя людзі, якія заўсёды спакойна імкнуцца вырашаць усе пытанні. Наш народ з павагай і пашанай ставіцца да продкаў, якія пакінулі нам найкаштоўнейшую спадчыну, забяспечылі мірнае жыццё. Беражлівыя адносіны да гістарычных, культурных каштоўнасцяў яшчэ раз даказваюць духоўную, маральную прыгажосць унутранага свету беларусаў.

Дзе б ні быў беларус, якую б прыгажосць іншых краін ні ацэньваў, усё роўна Бацькаўшчына будзе займаць у яго сэрцы галоўнае месца, бо родныя мясціны — самыя прыгожыя. Край блакітных азёраў, густых лясоў, неабсяжных палёў, зялёных лугоў, залатога лёну, прыгожых рамонкаў і васількоў... Некранутыя цудоўныя краявіды заўсёды захапляюць незвычайнасцю і харастом.

Беларусы здаўна вылучаліся ад іншых сваёй прыгажосцю. Мяккія рысы аблічча, чыстыя блакітныя вочы, светлыя валасы, аксамітны голас. Хлопцы і дзяўчаты ў нас самыя прыгожыя!

Беларусь... Беларусы... Гэтыя словы песняй гучаць на вуснах. Мы ж — беларусы...

Любімай краіне прысвячаю верш!

❑❑❑

Немагчыма без роднай зямлі
І знаёмых з дзяцінства прасторaў,
Без лясоў, дзе пяюць салаўі,
Без блакітных, як неба, азёраў.

Не забуду ніколі дарог,
Што вядуць да цаглянае хаты,
І знаёмы бацькоўскі парог,
Што на радасць і ўсмешкі багаты.

Немагчыма без родных краёў —
Дораць радасць яны і пяшчоту.
Толькі восеньскі крык жураўлёў
Навявае ў душы адзіноту...

Марына ЛЯШКЕВІЧ, студэнтка 1 курса Інстытута журналістыкі БДУ, фота аўтара.

Пра аўтара

Марыне 18 гадоў. Па прызнанні дзяўчыны, ёй падабаецца журналістыка, паэзія і проза. Марына любіць чытаць мастацкую літаратуру. З любімых беларускіх аўтараў згадвае найперш Янку Брыля, Васіля Быкава, Івана Мележа (асабліва вылучае яго «Палескую хроніку», напэўна, таму, што нарадзілася ў Столінскім раёне). З рускамоўных аўтараў любіць Міхаіла Булгакава, Фёдара Дастаеўскага.

— У школе любімым прадметам у мяне была беларуская мова і літаратура, ды і ва ўніверсітэце — таксама. Я заўсёды захапляюся прыродай, яе незвычайным харастом. А яшчэ я вельмі люблю сваю краіну! — гаворыць Марына. Менавіта гэтае пачуццё яна паспрабавала перадаць у сваім конкурсным творы.

ШКОЛА ЖЫЦЦЯ

СЛЕД НА ЗЯМЛІ

«Я самы шчаслівы чалавек, — гаворыць Валянціна Васільеўна Клімашэўская, — усё маё жыццё прайшло ў школе». І сапраўды, Валянціна Васільеўна — чалавек-легенда Пачапаўскай сярэдняй школы Баранавіцкага раёна. Яна аддала ёй 30 гадоў свайго жыцця.

Нарадзілася будучая настаўніца тут жа, у Пачапаве, у 1934 годзе. Сярод аднагодкаў Валянціна вылучалася сваёй актыўнай жыццёвай пазіцыяй, жаданнем удзельнічаць ва ўсіх школьных справах, дапамагаць людзям. Менавіта тады дзяўчына зразумела, што школа — гэта яе жыццё.

Верыць і не здавацца

Хуткай птушкай праляцелі гады вучобы спачатку ў Баранавіцкім настаўніцкім інстытуце, затым у Брэсцкім педагагічным інстытуце імя А.С. Пушкіна. Гады вучобы на філалагічным факультэце запомніліся Валянціне Васільеўне сустрэчамі з таленавітымі метадыстамі, рознымі цікавымі людзьмі, моцным сяброўствам, якое перамагло і гады, і адлегласці, і выпрабаванні. Асаблівы след пакінуў у душы Уладзімір Калеснік. Менавіта дзякуючы яму ў Валянціны Васільеўны з'явілася ўпэўненасць у сваіх сілах, у значнасці абранай прафесіі.

Скончыўшы інстытут у ліку лепшых студэнтак, дзяўчына атрымала дыплом філолага, настаўніка рускай, беларускай мовы і літаратуры. Працавала Валянціна Васільеўна ў розных школах. Хто ведае, куды лёс закінуў бы маладую настаўніцу, каб не адкрыццё ў 1971 годзе Пачапаўскай сярэдняй школы? Новы прасторны будынак, новая мэбля, вялікія дошкі, мноства парт...

Колькі сіл трэба было прыкласці, колькі напісаць прашэнняў, колькі разоў з'ездзіць да кіраўніцтва раёна з адной мэтай — пабудаваць у вёсцы школу, — ведае толькі яна сама. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, настаўніца не здавалася, заўсёды верыла ў перамогу — і не памылілася.

Поўная ідэй і энтузіязму, Валянціна Васільеўна з галавой акунулася ў школьныя справы. Настаўніцы пашанцавала: побач з ёй працавалі маладыя, але перспектыўныя педагогі. Сумеснымі намаганнямі ім удалося зрабіць многае: упрыгожыць школьны двор, пасадзіць алею, якая захавалася да сённяшніх дзён, добраўпарадкаваць стадыён... Валянціна Васільеўна настойліва дабівалася праўды, заўсёды была на баку справядлівасці, таму некаторыя яе пабойваліся, імкнуліся прамаўчаць.

Урок дабрыні

«Кожную раніцу каля маёй хаты спяшаюцца дзеці ў школу, — дзеліцца сваімі думкамі настаўніца. — Я люблю назіраць за вучнёўскімі ручайкамі, якія спешна зліваюцца ў шырокую раку каля школьных дзвярэй». Шмат разоў жанчына задавала сабе пытанне: ці магло быць інакш? Не, не магло.

Урокі Валянціны Васільеўны вылучаліся асаблівай дабрынёй і чалавечнасцю. «Многія лічаць, — разважае настаўніца, — што прыгажосць выратуе свет, а я з гэтым не згодная. Дабрыня, толькі яна можа дапамагчы выжыць нам у наш духоўна збяднелы час».

Кожны ўрок быў не падобны на папярэдні. Разам з тым, ён быў працягам яшчэ адной старонкі кнігі пад назвай «Школа жыцця». Асабліва выдзяляліся ўрокі літаратуры. Кожны — гэта адкрыццё. Галоўным быў не аналіз твора і літаратурных герояў. Гэта быў яшчэ адзін крок у жыццё, поўнае трывог і клопатаў. Задача педагога, на думку Валянціны Васільеўны, дапамагчы вучню не зламацца, навучыцца пераадольваць усе жыццёвыя цяжкасці і, разам з тым, застацца Чалавекам. Настаўніца не раз паўтарала: няма цяжкіх вучняў — трэба толькі знайсці правільны ключ да сэрца дзіцяці. Маладыя настаўнікі, якія траплялі ў школу, здзіўляліся: як можна весці ўрок, ні разу не павысіўшы голасу? Валянціна Васільеўна толькі ўсміхалася і запрашала да сябе на ўрок.

«Многія лічаць, — разважае настаўніца, — што прыгажосць выратуе свет, а я з гэтым не згодная. Дабрыня, толькі яна можа дапамагчы выжыць нам у наш духоўна збяднелы час».

Лёс ніколі не быў да настаўніцы ласкавым. Цяжкае пасляваеннае дзяцінства, няўдалае асабістае жыццё, пастаянныя змаганні з хлуснёй і падхалімствам... Аднак Валянціна Васільеўна ніколі не падала духам, заўсёды была аптымістам. Менавіта таму, напэўна, яна была адной з нямногіх дэлегатаў 10-га і 18-га З'ездаў прафсаюза ў Крамлі, 7-га З'езда настаўнікаў у Мінску. За карпатлівую, адданую працу, за сваё майстэрства Валянціна Васільеўна была ўзнагароджана многімі граматамі і медалямі. Яна па праве атрымала званне «Выдатніка народнай асветы БССР», «Выдатніка адукацыі СССР». У 1989 годзе ёй прысвоілі званне «Настаўнік-метадыст». Не кожны настаўнік сёння можа пахваліцца такім багаццем. Але Валянціна Васільеўна не любіць дэманстраваць свае ўзнагароды людзям. «Што медалі, гэта не галоўнае, — сціпла гаворыць яна. — Самы галоўны мой медаль — любоў і павага вучняў».

Святло ў акенцы

Памыліцца той, хто думае, што клопаты Валянціны Васільеўны звязаны толькі са школьнымі справамі. Кожны старажыл у вёсцы зможа сказаць шмат цёплых слоў у адрас настаўніцы. На працягу 22 гадоў яна была дэпутатам Пачапаўскага сельскага савета. Менавіта з яе дапамогай удалося за адзін год пабудаваць і адкрыць фельдшарска-акушэрскі пункт, які працуе і сёння, сабраць усе неабходныя дакументы для аднаўлення і рэканструкцыі мясцовай царквы XVII стагоддзя, якая была знішчана ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а цяпер прываблівае жыхароў і гасцей з усяго Баранавіцкага раёна. А колькі маленькіх, непрыкметных на першы погляд, але вельмі важных для аднавяскоўцаў спраў дапамагла вырашыць Валянціна Васільеўна! Сама ж настаўніца жыве сціпла, у простай вясковай хаце, трымае невялікую гаспадарку.

...Накормлены куры, кот і сабака, бульба падрыхтавана да пасадкі, на стале скрыні з маленькімі сцяблінкамі памідораў. Заўтра трэба палісаднік у парадак прывесці, бо хутка і кветкі сеяць. Павольным крокам ідзе Валянціна Васільеўна дадому. Цела стамілася за цяжкі веснавы дзень і патрабуе адпачынку. Утульна ўсеўшыся ў любімае крэсла, узяўшы ў рукі любімую кнігу, Валянціна Васільеўна зноў і зноў вяртаецца ў далёкае мінулае, у тую сонечную вераснёўскую раніцу, калі яна ўпершыню пераступіла парог Пачапаўскай сярэдняй школы. Маладая дзяўчына ў светлай сукенцы, з доўгімі льнянымі валасамі, добразычлівай усмешкай, ззяючымі вачыма была перапоўнена думкамі, ідэямі, планамі, многія з якіх здзейсніліся. Прайшло шмат часу.... Замест маладой дзяўчыны перад намі сядзіць жанчына з такімі ж доўгімі, але ўжо прыцярушанымі сівізной валасамі, з маршчынкамі каля вачэй і вуснаў. І толькі ўсё тая ж ўсмешка, тыя ж ззяючыя дабрынёй вочы, што аказаліся мацнейшымі за подых часу. «Калі б можна было пачаць жыццё нанова, я выбрала б тую ж дарогу — настаўніцтва, — упэўнена кажа Валянціна Васільеўна. — Больш мне нічога не трэба».

Ідуць гады. Шмат вучняў скончыла школу, шмат змянілася і настаўнікаў. Час мяняецца, мяняюцца людзі, але вечнай застаецца дабрыня — тая, якая можа выратаваць усіх нас ад духоўнага збяднення, ад духоўнай пагібелі, тая, якой усе гады вучыла дзяцей Валянціна Васільеўна Клімашэўская. Мы, сённяшнія вучні, не заўсёды разумеем сама-адданасць працы нашых настаўнікаў, не заўсёды бываем уважлівымі і ўдзячнымі ім.

За акном вечарэе. У акенцы хаты Валянціны Васільеўны гарыць святло. Напэўна, яна чытае кнігу або вышывае. Усё скончана? Не, заўтра будзе новы дзень, які прынясе новыя клопаты і радасці. «Мы яшчэ паваюем!» — узгадвае з усмешкай словы Тургенева Валянціна Васільеўна Клімашэўская.Так, мы яшчэ паваюем, Валянціна Васільеўна!

Яўгенія КАНДРАТЧЫК, вучаніца 9 класа Пачапаўскай сярэдняй школы Баранавіцкага раёна.

Пра аўтара

Яўгеніі 15 гадоў. Яна вясёлая дзяўчына з актыўнай жыццёвай пазіцыяй і разнастайнымі захапленнямі. У прыватнасці, любіць займацца спортам, прыгожа вышывае. Цікавіцца гісторыяй свайго краю, шмат чытае. Перавагу аддае кнігам па гісторыі. З вялікім задавальненнем удзельнічае ва ўсіх школьных мерапрыемствах, асабліва тэатралізаваных. Яўгенія — член літаратурнага гуртка «Задорынка», прымае актыўны ўдзел у падрыхтоўцы кожнага нумара школьнай газеты, адказвае ў ёй за рубрыку «Навіны месяца». Вядома ж, марыць у будучыні стаць журналістам. «Хацелася б», — сціпла кажа сама дзяўчына.

УШАНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

Березинского района Минской области (ДАЛЕЕ — ПРОДАВЕЦ) проводит повторный открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в д. Мурово

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый №	Площадь земельного участка, га	Наличие инженерных сетей	Расходы по подготовке документации, необходимой для проведения аукциона	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. рублей)
1	**Березинский район, д. Мурово, 620485305601000033**	0,1828	Электроснабжение, водопровод	3592807	3000000	300000

** Примечание: земельный участок имеет ограничения в использовании земель в связи с нахождением в водоохранной зоне реки Березина.*

Задаток перечисляется на р/с № 3604060201852 в ЦБУ № 602 филиал № 612 АСБ «Беларусбанк» код 810, УНП 600082366.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона (по каждому Лоту).

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с документацией и земельным участком.

Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Аукцион состоится **28 мая 2013 года в 10.00** по адресу: аг. Уша Березинского района, пер. Школьный, 2 (здание сельисполкома).

Заявления на участие и необходимые документы принимаются до **24 мая 2013 г.** ежедневно (кроме субботы и воскресенья) с 9.00 до 17.00 по адресу: аг. Уша Березинского района, пер. Школьный, 2.

Контактный телефон: (8 017 15) 49 435.

ОАО «Минскторгмаш»

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 28 мая 2013 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 22.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет председателя ликвидационной комиссии ОАО «Минскторгмаш».
2. Об отмене процедуры ликвидации ОАО «Минскторгмаш».
3. Избрание членов Наблюдательного совета, ревизора ОАО «Минскторгмаш».
4. Об утверждении размера денежного вознаграждения членам Наблюдательного совета ОАО «Минскторгмаш».
5. О выплате дивидендов акционерам ОАО «Минскторгмаш» по итогам 2012 года.

Регистрация начинается в 9.45. При себе иметь паспорт.

УНП 100103798 Ликвидационная комиссия.

Утерянный представительством Белгосстраха по Центральному району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и заболеваний формы 2РН серии БН № 0863940 **считать недействительным.**

УНП 101883943

ОАО «Дорожно-строительный трест № 3»

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 28 мая 2013 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Об участии открытого акционерного общества в холдинге «Белавтодор» в качестве дочерней компании.
2. Об оплате услуг управляющей компании холдинга на основании договора между управляющей компанией холдинга «Белавтодор» и участником холдинга.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться **28.05.2013 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — **20.05.2013 г.**

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию по адресу: **г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 40.**

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров — доверенности, зарегистрированные в соответствии с «Инструкцией о порядке регистрации доверенностей, предусматривающих передачу прав, удостоверенных акциями», утвержденной постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30.08.2006 г. № 1093).

Справки по телефонам: 28 40 20, 23 64 87 — Отдел кадровой и правовой работы.

УНП 700049607 *Наблюдательный совет.*

Уважаемые акционеры

ОАО «Торгразвитие»!

Приглашаем Вас принять участие во внеочередном Общем собрании акционеров ОАО «Торгразвитие», которое состоится 11 июня 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Вильямса, 45, каб. № 23.

Начало регистрации участников собрания с 10.00 до 10.30.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О крупной сделке Общества.
2. Утверждение договора купли-продажи.

УНП 100041437 *Наблюдательный совет.*

ОАО «БЕЛАГРОПРОМБАНК»

С 15 мая 2013 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 07.05.2013 № 272, размер ставки рефинансирования установлен в размере 25,0 процента годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает о снижении процентных ставок по договорам банковского вклада «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006 и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006 на 2 процентных пункта с 17.06.2013.

Телефон Контакт-центра Банка – 136
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

19 июня 2013 года в 10.00 в УЛУКОВСКОМ СЕЛЬСКОМ ИСПОЛНИТЕЛЬНОМ КОМИТЕТЕ по адресу: агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а состоится АУКЦИОН на право заключения договора аренды земельного участка

Наименование	Место, дата, время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов	Кадастровые номера и адреса земельных участков, их количество и размеры, целевое назначение	Вещное право на земельный участок	Начальная цена предмета аукциона применительно к каждому земельному участку	Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителями аукциона	Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета	Организация, которая предоставляет информацию о месте размещения земельных участков, которые предполагается передать в аренду	Адрес и номер контактного телефона комиссии или организации
Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а Время начала приема заявлений: с 16.05.2013 г. по 14.06.2013 г. с 8.30 до 17.30 13.00-14.00 обед	321089200601000396 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома площадью 0,1076 га. Гомельская область, Гомельский район, д. Березки, У-42	Аренда сроком на 99 лет	34173975 (Тридцать четыре миллиона сто семьдесят три тысячи девятьсот семьдесят пять) белорусских рублей	Расходы в сумме 1922650 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления	Задаток в сумме 3 417 400 (три миллиона четыреста семнадцать тысяч четыреста) белорусских рублей на р/с 3641414220021 в ЦБУ № 305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002	Улуковский сельский исполнительный комитет, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, тел.: 93-62-75, 93-60-54, 93-62-49
Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а Время начала приема заявлений: с 16.05.2013 г. по 14.06.2013 г. с 8.30 до 17.30 13.00-14.00 обед	321089200601000399 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома площадью 0,1060 га. Гомельская область, Гомельский район, д. Березки, У-7	Аренда сроком на 99 лет	33665812 (Тридцать три миллиона шестьсот шестьдесят пять тысяч восемьсот двенадцать) белорусских рублей	Расходы в сумме 1985750 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления	Задаток в сумме 3366580 (три миллиона триста шестьдесят шесть тысяч пятьсот восемьдесят) белорусских рублей на р/с 3641414220021 в ЦБУ № 305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002	Улуковский сельский исполнительный комитет, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, тел.: 93-62-75, 93-60-54, 93-62-50
Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а Время начала приема заявлений: с 16.05.2013 г. по 14.06.2013г. с 8.30 до 17.30 13.00-14.00 обед	321089200601000397 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома площадью 0,1235 га. Гомельская область, Гомельский район, д. Березки, У-28	Аренда сроком на 99 лет	39223847 (Тридцать девять миллионов двести двадцать три тысячи восемьсот сорок семь) белорусских рублей	Расходы в сумме 2056650 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления	Задаток в сумме 3922390 (Три миллиона девятьсот двадцать две тысячи триста девяносто) белорусских рублей на р/с 3641414220021 в ЦБУ № 305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002	Улуковский сельский исполнительный комитет, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, тел.: 93-62-75, 93-60-54, 93-62-51
Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а Время начала приема заявлений: с 16.05.2013 г. по 14.06.2013 г. с 8.30 до 17.30 13.00-14.00 обед	321089200601000400 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома площадью 0,1097 га. Гомельская область, Гомельский район, д. Березки, У-35	Аренда сроком на 99 лет	34840939 (Тридцать четыре миллиона восемьсот сорок тысяч девятьсот тридцать девять) белорусских рублей	Расходы в сумме 1922650 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления	Задаток в сумме 3484100 (Три миллиона четыреста восемьдесят четыре тысячи сто) белорусских рублей на р/с 3641414220021 в ЦБУ № 305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002	Улуковский сельский исполнительный комитет, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, тел.: 93-62-75, 93-60-54, 93-62-52
Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а Время начала приема заявлений: с 16.05.2013 г. по 14.06.2013 г. с 8.30 до 17.30 13.00-14.00 обед	321089200601000398 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома площадью 0,1090 га. Гомельская область, Гомельский район, д. Березки, У-1	Аренда сроком на 99 лет	34618618 (Тридцать четыре миллиона шестьсот восемнадцать тысяч шестьсот восемнадцать) белорусских рублей	Расходы в сумме 2110500 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления	Задаток в сумме 3461860 (три миллиона четыреста шестьдесят одна тысяча восемьсот шестьдесят) белорусских рублей на р/с 3641414220021 в ЦБУ № 305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002	Улуковский сельский исполнительный комитет, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, тел.: 93-62-75, 93-60-54, 93-62-53
Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а Время начала приема заявлений: с 16.05.2013 г. по 14.06.2013 г. с 8.30 до 17.30 13.00-14.00 обед	321089200601000437 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома площадью 0,1088 га. Гомельская область, Гомельский район, д. Березки, У-58	Аренда сроком на 99 лет	35008685 (Тридцать пять миллионов восемь тысяч шестьсот восемьдесят пять) белорусских рублей	Расходы в сумме 3118500 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления	Задаток в сумме 3500900 (три миллиона пятьсот тысяч девятьсот) белорусских рублей на р/с 3641414220021 в ЦБУ № 305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002	Улуковский сельский исполнительный комитет, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, тел.: 93-62-75, 93-60-54, 93-62-53
Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а Время начала приема заявлений: с 16.05.2013 г. по 14.06.2013 г. с 8.30 до 17.30 13.00-14.00 обед	321089200601000438 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома площадью 0,1146 га. Гомельская область, Гомельский район, д. Березки, У-67	Аренда сроком на 99 лет	36266889 (Тридцать шесть миллионов двести шестьдесят шесть тысяч восемьсот восемьдесят девять) белорусских рублей	Расходы в сумме 2968400 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления	Задаток в сумме 3626700 (три миллиона шестьсот двадцать шесть тысяч семьсот) белорусских рублей на р/с 3641414220021 в ЦБУ № 305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002	Улуковский сельский исполнительный комитет, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, тел.: 93-62-75, 93-60-54, 93-62-53
Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а Время начала приема заявлений: с 16.05.2013 г. по 14.06.2013 г. с 8.30 до 17.30 13.00-14.00 обед	321089200601000439 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома площадью 0,1102 га. Гомельская область, Гомельский район, д. Березки, У-38	Аренда сроком на 99 лет	35500930 (Тридцать пять миллионов пятьсот тысяч девятьсот тридцать) белорусских рублей	Расходы в сумме 2968400 белорусских рублей и расходы, связанные с опубликованием объявления	Задаток в сумме 3550100 (три миллиона пятьсот пятьдесят тысяч сто) белорусских рублей на р/с 3641414220021 в ЦБУ № 305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 151501664, получатель Улуковский сельский исполнительный комитет, код платежа 04002	Улуковский сельский исполнительный комитет, агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а	Агрогородок Улуковье, ул. Октябрьская, 1а, тел.: 93-62-75, 93-60-54, 93-62-53

ОАО «НАФТАН»
РЕАЛИЗУЕТ НА КОНКУРСНОЙ ОСНОВЕ
(с повышением начальной цены)
бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:

- **Автомашина ГАЗ 3307, 1992 г., начальная цена — 12 600 000 белорусских рублей;**
- **Трактор МТЗ-80, 1992 г., начальная цена — 22 200 000 белорусских рублей.**

Состояние удовлетворительное.
Предложения принимаются по адресу: 211440, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101
с пометкой: «Реализация неликвидов, транспорт» до 30 мая 2013 года.

Извещение на проведение конкурса размещено на сайте **www.naftan.by.**

Контактные телефоны:
8 (0214) 55 78 85, 8 (0214) 55 78 66, (044) 758 08 33, (044) 553 02 59.

УНП 300042199

УНН 100135303

Уважаемые акционеры!
29 мая 2013 г. в 15.00
СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ
ОАО «Белдортехника».
Место проведения:
г. Смолевичи, ул. Торговая, 14 «Б», актовый зал.

Повестка дня:
1. Об участии открытого акционерного общества в холдинге «Белавтодор» в качестве дочерней компании.
2. Об оплате услуг управляющей компании холдинга на основании договора между управляющей компанией холдинга «Белавтодор» и участников холдинга.

Место проведения: г. Смолевичи, ул. Торговая, 14 «Б», актовый зал.
Регистрация участников собрания — с 14.30 до 15.00.
Акционерам при себе иметь паспорт (представителям — паспорт и доверенность).

Отделом культуры Лельчицкого райисполкома
на сайте электронной торговой площадки
http://www.goszakupki.by/,
размещено приглашение на участие в электронном аукционе на поставку:
«Автобус среднего класса междугороднего сообщения».
Окончание срока подачи предложений 24.05.2013 г.

УНП 400009044

Открытое акционерное общество
«Дорожно-строительный трест № 5»
(г. Минск, ул. Широкая, 26)
извещает о проведении 28 мая 2013 года в 11 часов 00 минут внеочередного общего собрания акционеров по адресу: г. Минск, ул. Широкая, 26 (актовый зал).

Форма проведения собрания: очная.

Инициатор созыва: наблюдательный совет.

Основание созыва: требование акционера Общества, обладающего в совокупности не менее чем 10 % голосов от общего количества голосов акционеров Общества.

ПОВЕСТКА ДНЯ:
1. Об участии открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 5» в холдинге «Белавтодор» в качестве дочерней компании.
2. Об оплате услуг управляющей компании холдинга «Белавтодор» на основании договора между управляющей компанией холдинга «Белавтодор» и участником холдинга.

С материалами собрания можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Широкая, 26, отдел механизации и энергетики, по рабочим дням **с 18 мая 2013 года по 27 мая 2013 года** с 8.00 до 17.00 (понедельник—четверг) и с 8.00 до 15.45 (пятница) либо **28 мая 2013 года** по месту проведения собрания, тел. для справок (017) 281 24 27.

Регистрация акционеров (их представителей), прибывших на собрание: **28 мая 2013 года с 09.30 до 10.45** по месту проведения собрания. При себе иметь паспорт, представителю акционера иметь паспорт и доверенность акционера или договор.

УНП 100219908

Наблюдательный совет ОАО «ДСТ № 5».

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, принадлежащего ООО «Миндавг»

Лот № 1. 1200049/0 (ООО «Миндавг») Акции ЗАО «Футбольный клуб «ДИНАМО-МИНСК», выпуск 1/1 простые (обыкновенные) акции (BY 5200173736), находящиеся в депозитарии ООО «Промреестр», в количестве 5 штук, начальной стоимостью 1 425 231 490 (Один миллиард четыреста двадцать пять миллионов двести тридцать одна тысяча четыреста девяносто) белорусских рублей.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества, что составляет 71 261 575 (Семьдесят один миллион двести шестьдесят одна тысяча пятьсот семьдесят пять) белорусских рублей.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/,
а также в помещении хозяйственного суда г. Минска:
г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

Торги состоятся 31.05.2013 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201

За дополнительной информацией обращаться:

судебный исполнитель Ляхова Е.Ю., тел./факс: 8(017) 294 93 56, 8(029) 177 32 52

ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294 93 67

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г.Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в населенных пунктах Батуринка, Домашаны, Скураты Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

1	**Форма проведения аукциона**	Открытый
2	**Дата, время и место проведения аукциона**	18 июня 2013 года в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний
3	**Продавец и его адрес**	Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27
4	**Земельный участок, его кадастровый номер и адрес**	Лот № 1 — площадь 0,1930 га (по генплану № 17, кв. 4) № 624883001101000167 д. Батуринка Лот № 2 — площадь 0,1931 га (по генплану № 14, кв. 4) № 624883001101000117 д. Батуринка Лот № 3 — площадь 0,15 га, № 624883003601000286 д. Домашаны (пер. Поселковый) Лот № 4 — площадь 0,1338 га, № 624883001101000287 д. Домашаны (ул. Солнечная) Лот № 5 — площадь 0,1500 га № 624883009101000179 д. Скураты (ограничение в использовании — водоохранная зона р. Плиса)
5	**Условия продажи**	Без изменения целевого назначения
6	**Целевое назначение земельного участка**	Для строительства и обслуживания жилого дома
7	**Начальная (стартовая) цена продажи**	Лот № 1 — 150 000 000 рублей Лот № 2 — 150 000 000 рублей Лот № 3 — 50 000 000 рублей Лот № 4 — 50 000 000 рублей Лот № 5 — 50 000 000 рублей
8	**Условия аукциона**	А) продажа по цене не ниже начальной; Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь
9	**Наличие инженерной инфраструктуры**	д. Батуринка — подъездные дороги, д. Домашаны — нет, д. Домашаны — подъездные дороги, д. Скураты — электричество
10	**Условия оплаты**	За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона
11	**Сумма задатка и реквизиты продавца**	10% от начальной (стартовой) цены земельного участка р/с 3641000000058 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок») УНП 600046563 (МФО 153001812)
12	**Порядок предв. ознаком. в натуре с земельными участками**	Среда в 11.00
13	**Прием документов**	в рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00
13	**Окончательный срок приема документов**	11 июня 2013 года в 17.00
14	**Контактные телефоны**	8 01776 44 636, 68 030

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:
1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).
3. Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

■ Ведай нашых!

МЕДАЛЬНЫ ЗВОН

10 медалёў прывезлі беларускія школьнікі з 47-й міжнароднай Мендзялееўскай алімпіяды па хіміі, якая праходзіла ва Узбекістане. Усяго ў спаборніцтвах узялі ўдзел 118 школьнікаў з 17 краін. На рахунку беларусаў 1 залаты медаль, 5 сярэбраных і 4 бронзавыя ўзнагароды.

З залатой узнагародай вярнуўся на радзіму навучэнец сталічнай гімназіі № 1 імя Ф.Скарыны Сяргей Кузоўчыкаў. Сярэбраны медаль заваявалі Мікалай Арцюшэўскі (Ліцэй БДУ), Аляксандра Дземідовіч (гімназія № 15, г.Мінск), Аляксандра Радчанка (гімназія №7, г.Маладзечна), Лізавета Петрусевіч (гімназія № 29 г. Мінска) і Андрэй Швед (гімназія № 12, г. Мінск).

Бронзавыя медалі ў Ілы Зянькова (Мінскі абласны ліцэй), Кацярыны Нечыпаравай (Магілёўскі дзяржаўны абласны ліцэй №1), Цімафея Раманоўскага (СШ № 12, г.Слуцк) і Андрэя Лойкі (СШ № 165, г. Мінск).

Мендзялееўская алімпіяда школьнікаў па хіміі з'яўляецца пераемніцай Усесаюзнай хімічнай алімпіяды і працягвае яе нумарацыю. Удзел у ёй прымаюць вучні выпускных і перадвыпускных класаў з кола пераможцаў нацыянальных хімічных алімпіяд. Традыцыйна алімпіяда складаецца з трох тураў. У першым тэарэтычным туры прадугледжана восем абавязковых задач. У другім тэарэтычным туры ўдзельнікі ўжо самастойна выбіраюць пяць задач з 15 прапанаваных. І трэці тур — эксперыментальны.

Прызёры алімпіяды з краін СНД маюць права паступіць без экзаменаў у Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт.

Надзея НІКАЛАЕВА.

РАЗУМНЫЯ ПРАБ'ЮЦЦА САМІ

Усё больш таленавітых дзяцей Міншчыны заяўляюць аб сабе на міжнародным узроўні.

Навучэнец гімназіі №2 горада Салігорска Цімафей Малахоўскі ўвайшоў у склад каманды Беларусі, якая прадстаўляе нашу краіну на Міжнародным навукова-інжынерным конкурсе Intel International Science Engineering Fair 2013. Мерапрыемства праходзіць з 12 па 17 мая ў горадзе Фінікс (штат Арызона, ЗША).

Дадам, што навукова-інжынерны конкурс навучэнцаў у нашай краіне Belarus Science and Engineering Fair адбыўся сёлета ўпершыню. У ім удзельнічалі навучэнцы ўстаноў агульнай сярэдняй, прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі з усіх рэгіёнаў краіны. Заяўлены 72 работы, з якіх 39 — ад навучэнцаў Міншчыны. На гэтым форуме Цімафей Малахоўскі атрымаў Дыплом III ступені. Юнак паказаў вынікі эксперымента па атрыманні псеўдасплаваў алюмінію і шкла і даследаванні залежнасці іх супраціўлення ад тэмператур.

Таццяна ГЕОРГІЕВА.

О ВЫКУПЕ АКЦИЙ

Уважаемые акционеры
ОАО «Агрофирма «Рассвет»

ОАО «Агрофирма «Рассвет» настоящим уведомляет акционеров о принятии внеочередным общим собранием акционеров открытого акционерного общества «Агрофирма «Рассвет», проведенным в очной форме 07.05.2013 (протокол № 3), решения о выкупе акций ОАО «Агрофирма «Рассвет» Минским районным исполнительным комитетом. Для реализации своего права требовать выкупа акций акционеру необходимо предоставить в письменном виде в ОАО «Агрофирма «Рассвет» по адресу: 223016, Минский р-н, аг. Новый Двор, ул. Парковая, д. 8, администрация ОАО «Агрофирма «Рассвет», соответствующее заявление в течение 50 дней с даты принятия решения внеочередным общим собранием акционеров, повлекшего возникновение у акционеров права требовать выкупа их акций.

Для получения дополнительной информации предлагаем обращаться по адресу: Минский р-н, аг. Новый Двор, администрация ОАО «Агрофирма «Рассвет» (тел. 5087138, 5087125). Письменное требование акционера о выкупе принадлежащих ему акций должно содержать фамилию, имя, отчество и подпись акционера, а также количество акций, выкупа которых он требует.

УНП 600052822

Наблюдательный совет

Управляющий в производстве по делу о банкротстве
ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ
по продаже дебиторской задолженности ОДО «Террастройпроект-плюс» г. Мозырь

№ лота	Наименование дебитора	Сумма задолженности (руб.)	Стартовая цена (руб.)	Сумма залога (руб.)
1.	Ачаповский Константин Семенович, г. Мозырь, ул. Нагорная, 41	167 756 369	134 205 095	11 000 000
2.	Ачаповский Константин Семенович, г. Мозырь, ул. Нагорная, 41	71 264 805	57 011 845	4 000 000
3.	Сергеев Сергей Валерьевич, г. Мозырь, ул. Малинина, д. 19, кв. 24	27 025 291	19 912 260	1 000 000
4.	Сергеев Сергей Валерьевич, г. Мозырь, ул. Малинина, д. 19, кв. 24	27 025 291	21 620 235	1 000 000
5.	Ачаповский Константин Семенович, г. Мозырь, ул. Нагорная, 41 Сергеева Ирина Владимировна, г. Мозырь, ул. Малинина, д. 19, кв. 24	11 676 980	9 341 585	900 000

Продавец: ОДО «Террастройпроект-плюс» г. Мозырь.

Организатор торгов: управляющий Глинский Игорь Александрович.

Торги проводятся в форме открытого аукциона без условий.

Сумма залога вносится на р/с № 3012410630013 в «Приорбанк» ОАО ЦБУ 401 г.Мозырь, БИК 153001749, получатель ОДО «Террастройпроект-плюс», УНП 490322936.

Шаг аукциона 5–10%.

Победителем торгов признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

Форма, порядок оплаты: одноразовый безналичный платеж на счет продавца.

В случае признания торгов не состоявшимися, в связи с подачей заявления на участие только одним участником, возможна продажа предмета торгов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Документы, предоставляемые для участия в торгах: заявление на участие, копии платежных документов, подтверждающих внесение залога, копию устава, доверенность представителю юридического лица, паспорт физическому лицу.

Торги состоятся 30 мая 2013 года в 12.00 по адресу: г. Мозырь, ул. Советская, д. 120, к. 31.

Заявки принимаются до 12.00 29 мая 2013 года по адресу: г. Мозырь, ул. Советская, д. 120, к. 02.

Справки по телефону: 8 029 663 84 96.

SEX–БАЛЯСЫ

Ат, не паверыце, да чаго я люблю навукоўцаў і іх даследаванні! Не, ну сапраўды так! Ведаеце, як яно бывае часам: жывеш сабе жывеш, займаешся працай, нейкімі будзённымі клопатамі — усё ідзе па звыклай каляіне. І тут — бац! — навукоўцаў нешта зацікавіла і яны вырашылі не па-дзіцячы разабрацца ў пэўнай праблеме. І атрымліваецца, як у тым анекдоце. Бег неяк вожык па лесе і раптам забыўся, як дыхаць. І... памёр. Вось і ты таксама са «зламанымі» мазгамі пачынаеш сумнявацца: а ці правільна ты жыў дагэтуль?.. На гэты раз «харчаванне» для роздумаў падкінулі амерыканскія сацыёлагі, якія высветлілі, што часцей займаюцца сексам тыя сямейныя пары, дзе жанчына сама вядзе ўсю хатнюю гаспадарку.

ЧЫМ ПАХНЕ МУЖНАСЦЬ

Навукоўцы апыталі 4,5 тысячы пар і пастанавілі: калі сужэнец выконвае такую тыпова жаночую працу, як гатаванне, прасаванне, мыццё, прыбіранне, сексуальных кантактаў у яго ў паўтара раза менш, чым у сабрата па поле з сям'і, дзе ўсім гэтым займаецца менавіта жонка. Мужчыне «дазваляецца» толькі стрыгчы газон, адказваць за спраўнасць хатняй тэхнікі і плаціць па рахунках. І тады будзе яму сапраўднае «мужчынскае шчасце» ў ложку. Сацыёлагі не толькі вывелі гэтую формулу, але яшчэ і патлумачылі яе. Маўляў, калі жонка рэгулярна бачыць сужэнца з анучай у руках, ён падаецца ёй ужо не такім сексуальна прывабным. Тады ні табе эратычных фантазій, ні мар пра героя... Напрыканцы вучоныя ледзьве не трывогу б'юць: за паўстагоддзе колькасць амерыканскіх мужчын, якія выконваюць працу па хатняй гаспадарцы, павялічылася з 15 да 30 працэнтаў! (Ага, як быццам яны кашулі рукамі ў начоўках мыюць, а біфштэкс з крывёй для сям'і штодня на вогнішчы гатуюць...)



Раней была такая прымаўка: « Ад мужчыны павінна пахнуць потам, порахам і канём». Грубавата, але па сутнасці. Якраз тады жанчыны выконвалі ўсю працу па хатняй гаспадарцы. І, напэўна, не было для мужчынскага вока нічога больш прыемнага, чым, вярнуўшыся дадому, заспець там жонку, якая мыла падлогу, падаткнуўшы падол спадніцы... Гэта шматразова апісана ў класічнай мастацкай літаратуры, паказана ў выдатных савецкіх фільмах. У тыя ж самыя часы вышэйзгаданая прымаўка некалькі змянілася. Так званыя дасціпныя жартаўнікі пачалі сцвярджаць, што ад мужчыны павінна пахнуць тытунем, каньяком і добрым парфумам. Бо каня запрагаць і пахаць да сёмага поту ўжо не трэба было. Іншымі словамі, фізічная праца — спрадвечны занятак мужчын — ужо не была патрэбнай у сваім «класічным» праяўленні. Прайшло яшчэ колькі часу. І што зараз можна было б сказаць з той жа нагоды пра мужчын? «Дарагі, ты хочаш гарбаты?» — «Хачу!» — «Дык устань, схадзі на кухню і завары» — «Не, тады не хачу» — «Дык ляжы на канапе і не хлусі»?

Ведаеце, я зусім не хачу «ліць ваду на млын» феміністак. Проста зараз практычна сцерлася мяжа паміж тыпова мужчынскай працай і жаночай. Натуральна, я кажу пра быт найперш гарадскіх жыхароў. Мне, напрыклад, імпануюць словы майго вясковага суседа Славы, які мае дзвюх дарослых дачок (унучка таксама падрастае) і жонку-кулінара: «Я на кухню — ні нагой». Затое на падворку ён з усім спраўляецца фактычна адзін. Ці ва ўсіх мужчын ёсць такі ж занятак? Машыну — да майстра ў аўтасэрвіс, рамонт у жыллі — па аб'яўцы. Прычым нават гэтым часта могуць займацца найперш жанчыны. Ведаю некалькі зусім розных сем'яў, якіх аб'ядноўвае адна агульная рыса: як той казаў, першасныя мужчынскія палавыя прыкметы там... у жанчын. У адных выпадках яны самі пра тое кажуць, у іншых гэта дастаткова хутка кідаецца ў вочы, нягледзячы на знешняе «класічнае» размеркаванне роляў у сям'і. Бацькі сямействаў — рослыя, пры пасадах, пры грошах, а мужчына ў сям'і, як ні павярні, — жанчына. І калі пры такім раскладзе ў горадзе сям'я яшчэ можа дастаткова паспяхова існаваць, дык у вёсцы доўга — наўрад ці. Там хатнія клопаты выключна па палавой прыкмеце падзяліць складана.

...Вучоныя не былі б сапраўднымі вучонымі, каб, зрабіўшы свае высновы, самі ж у іх не засумняваліся. Вельмі паважаю іх за гэта, дарэчы. Як ужо казаў, галоўнае, мозг «зламаць». А «лячыць» яго ўжо самому даводзіцца. Дык вось, гэтыя самыя вучоныя ўсё ж не раяць мужчынам спасылацца на сваю працоўную дзейнасць, каб апраўдаць перад жонкамі нежаданне займацца хатнімі клопатамі. Маўляў, пры такім раскладзе ёсць шанс, што сексу ў вас... увогуле не будзе. Бо жанчынам падабаецца, каб іх выбраннікі дапамагалі ім па гаспадарцы. Дык чым у выніку павінна «пахнуць» мужнасць (ад слова «муж»)?

Думаю, не мае значэння, ці гэта пах памытай падлогі, ці, напрыклад, смажанай бульбы. Галоўнае, каб гэта было для ЯЕ. Напэўна, з анучай мужчына сапраўды выглядае не так эратычна. Але, як мне падаецца, іншым часам не сорамна ўзяць у рукі вышэйзгаданую анучу — каб змахнуць пыл з уласнай мужнасці.

...Калі мне часам падаецца, што ў вачах жонкі я выглядаю недастаткова мужна, у адказ на яе заўвагу: «Збоку такое ўражанне, што дровы самі па сабе сякуцца — ты так лёгка махаеш сякерай!» я прапаную проста патрымаць тую саму сякеру, каб адчуць усю «лёгкасць» мужчынскага быцця...

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

Інтымнае пытанне

ПАГАВАРЫ СА МНОЮ, МАМА!

Уявіце сітуацыю: вам 16 гадоў, у вас шмат сяброў і сёння вы збіраецеся на вечарыну з начоўкай. Маці можа спакойна ўспрыняць такую навіну. Але гэтая падзея стане цяпер маленькім сакрэтам, бо, напрыклад, бабулі ні ў якім разе нельга пра яе казаць: відавочна, што пажылая жанчына і сардэчны прыступ можа атрымаць. Дзе такое бачылі ў яе гады?

А падлеткам жа хочацца капіраваць паводзіны дарослых! Інтымныя адносіны паміж хлопцамі і дзяўчатамі — вось хвалюючы аспект іх жыцця! Ці павінны бацькі (і да якога часу) берагчы сваё дзіця ад знаёмства з супрацьлеглым полам? Ці магчыма такое ўвогуле? Адказаць на гэтыя і іншыя пытанні мы папрасілі *Ларысу Казімірчык*, падлеткавага псіхолага.

— Напачатку: чаму падлеткаў так прыцягвае гэтая «забароненая» тэма?

— Яны ўвогуле схільныя да пераймання ўбачанага на экранах тэлевізараў, ці, што сёння найбольш верагодна, у сеціве. СМІ — я маю на ўвазе замежныя каналы кшталту MTV, напрыклад, — прапагандуюць прымітыўную культуру. Многія з іх увогуле не звяртаюць увагу на ўзрост сваёй аўдыторыі. Пракантраляваць працэс набыцця новых ведаў, на жаль, немагчыма. Сёння дзеці самі выбіраюць, што ім глядзець ды чытаць. Збольшага паўплываць на падлетка могуць толькі бацькі. Але многія мамы і таты лепш уключаць тэлевізар і зоймуцца сваімі справамі, чым стануць размаўляць з дзіцем пра яго праблемы. У развітых краінах вынікі праведзеных сярод падлеткаў апытанняў прыкладна аднолькавыя: 75 працэнтаў з іх выказваюць сваю зацікаўленасць у тым, каб атрымліваць больш інфармацыі пра секс.

Палохае іншае: бацькі не падрыхтаваны да таго, што іх дзіця можа задаць пытанне пра інтымнае жыццё. А не атрымаўшы адказу ад дарослых, падлетак вымушаны шукаць яго ў іншых месцах — хутчэй за ўсё, у інтэрнэце. У выніку бездань новай інфармацыі падаецца такой «крутой», што не папляткарыць аб гэтым з суседкай па парце немагчыма. Такім чынам, адкладаючы размову з падлеткам пра сексуальныя адносіны, вы не засцерагаеце яго ні ад «дарослай» інфармацыі, ні ад далейшых дзеянняў.

— Значыць, галоўнае — гэта дыялог з бацькамі?

— Так, гэта вельмі важна. Бацькі, як ні хто іншы, ведаюць сваё дзіця, таму самі павінны адчуць, калі лепш распачаць гэту важную і вельмі патрэбную размову. Можна зрабіць акцэнт на фізіялогіі: напрыклад, сказаць, што дзявочы арганізм яшчэ не гатовы да «такога». Так будзе больш зразумела, бо па прычыне максімалізму падлетак

Бацькі не падрыхтаваны да таго, што іх дзіця можа задаць пытанне пра інтымнае жыццё. А не атрымаўшы адказу ад дарослых, падлетак вымушаны шукаць яго ў іншых месцах — хутчэй за ўсё, у інтэрнэце.

можа не ўспрыняць лекцыі пра нормы «этыкі дарослых»: спрацуе адваротны механізм і забароненая тэма стане нумарам адзін у галаве падлетка. У школах Еўропы і Амерыкі нават ёсць такі прадмет — «сексуальнае выхаванне», дзе сексуальнае жыццё — не забароненая тэма, а, наадварот, — абавязковая для вывучэння.

— Але што рабіць, калі падлетак ужо цудоўна разумее, што «гэта» такое і надае шмат увагі, напрыклад, наведванню сайтаў, якія не стасуюцца з яго ўзростам?

— Трэба памятаць: для многіх падлеткаў эмацыянальныя перажыванні больш важныя, чым непасрэдна фізічны працэс. Задача бацькоў — дапамагчы свайму дзіцяці зразумець, што абмежаванне адносін толькі сексам пагражае фізічным і эмацыянальным спусташэннем.

— Ці ёсць рызыка, што ранняя дасведчанасць у пытаннях сексуальнага жыцця можа нашкодзіць псіхіцы падлетка?

— Сапраўды, пабачыўшы на сайтах эратычныя фотаздымкі, падлетак можа зрабіць паспешлівыя і не зусім правільныя высновы. Ёсць рызыка расчаравацца і згубіць разуменне таго, якую ролю ў жыцці адыгрывае секс. Ды і першая блізкасць таксама можа расчараваць... А калі першы сексуальны досвед аказаўся малапрыемным, то падлетак можа і ўвогуле адмовіцца ад думак пра секс.

— Ці варта хвалявацца, калі падлетак вядзе палавое жыццё?

— Адзінага меркавання на гэты конт няма: усё залежыць ад псіхалагічнай сталасці падлетка. Сучаснае асяроддзе само падштурхоўвае падлеткаў да павышанай і ранняй зацікаўленасці ў сексе. Час ідзе, і, напэўна, нам трэба прымаць яго. Адзінае, што, безумоўна, трэба кантраляваць, — гэта неразборлівасць у дачыненні да партнёраў.

...Паслухаўшы спецыяліста, няцяжка прыйсці да высновы, што здаровага маладога чалавека рана ці позна абавязкова зацікавяць пытанні сексуальнага жыцця, на якія ён будзе шукаць адказы. І менавіта бацькі могуць дапамагчы яму ў пошуку патрэбнай інфармацыі. Калі зараз яны чытаюць гэты артыкул, хачу звярнуцца да іх: мы вельмі чакаем разумення з вашага боку і адказаў на хвалюючыя пытанні. Таму не саромейцеся з намі размаўляць!

Хоць, бывае, што і падлеткам цяжка расказаць пра свае перажыванні: усё ж тэма — вельмі інтымная. Як выйсці з гэтай сітуацыі, падказвае Ларыса Казімірчык:

— Не трэба баяцца: мама — дарослая жанчына, і яна можа параіць нешта карыснае, бо падлеткі яшчэ шмат чаго не ведаюць, нават нягледзячы на сваё ўпартае жаданне праверыць тэарэтычныя веды на практыцы. І чым раней падлетак падзеліцца з бацькамі, тым спакайней будзе і яму, і яго бацькам. У гэтай сітуацыі можна ўявіць сябе на месцы маці: як бы вы хацелі, каб да вас ставілася ўласная дачка?..

Ганна ПЯРОВА.
Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Майна ўвазе

КАЛІ ЗАГАР НЕ НА ЗДАРОЎЕ...

У Злучаных Штатах Амерыкі маюць намер забараніць карыстацца салярыямі падлеткам да 18 гадоў.

Па словах экспертаў, гэтыя меры скіраваны на абарону падлеткаў, паколькі салярыі ўяўляюць сур'ёзную рызыку для іх здароўя. У апошнія гады статыстыка злаякасных новаўтварэнняў скуры — меланомы, базіліёмы і пласкаклетачнага рака — дэманструе ўстойлівы рост у моладзевым асяродку. Анколагі тлумачаць гэты факт захапленнем моладзі загарам — як натуральным, сонечным, так і пад промнямі ультрафіялетавых лямпаў у салярыях.

Ініцыятыва вынесена на грамадскае абмеркаванне, якое працягнецца тры месяцы. Фактычна гэта першы значны крок па абароне здароўя падлеткаў у ЗША, бо ў некаторых салярыях дазваляюць загараць нават 10-гадовым дзецям. Салярыі ў ЗША практычна не кантралююцца. Праведзеныя нядаўна даследаванні паказалі, што рызыка развіцця меланомы на 75% вышэй у людзей, якія падвяргаліся ўздзеянню ультрафіялетавага выпраменьвання ў салярыях. У сувязі з гэтым салярыі забаранілі наведваць падлеткам да 18 гадоў у Германіі, Францыі, Вялікабрытаніі і Аўстрыі. А ў Бразіліі, напрыклад, салярыі ўвогуле забаронены.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.

Адрас рэдакцыі:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 24.217.
Нумар падпісаны ў 19.30 15.05.2013 г.

■ Нефармат Святланы Яскевіч

ПРА ТЫХ, ХТО БЛІЖЭЙ ДА ІСЦІНЫ

Нядаўна давялося пісаць артыкулы пра рэабілітацыйны цэнтр для інвалідаў. Дагэтуль былі доўгія перамовы з яго дырэктарам па тэлефоне. Галіна Пятроўна расказвала, як стварала ўстанову, шукала памяшканне, арганізоўвала работу, потым пра тое, колькі кабінетаў абышла ў пошуках падтрымкі, калі цэнтр прыпыніў сваю дзейнасць па прычыне вострай патрэбы ў рамонце. «Вельмі энергічная дама, — падумала я. — Прабіўная, настойлівая, хуткая на пад'ём». А калі прыехала і ўбачыла яе, адчула сапраўдны шок: мяне сустрэла жанчына ў інваліднай калясцы!

Справіцца з сабой, не паказаць здзіўленне было не вельмі лёгка. А яна са шчырай усмешкай гаварыла аб тым, як добра, што нарэшце скончылася разводдзе, падсохла дарога, і можна без праблем даехаць да ўстановы, якая стала справай яе жыцця.

— Вось так і жыву, з каляскі — у машыну, з машыны — у каляску, — распавядала мая гераіня. — Муж у мяне таксама інвалід-калясачнік. У яго ў руках усё гарыць, ён механік першакласны, машыны рамантуе, шмат чаго ўмее яшчэ рабіць.

...Нам — з рукамі і нагамі — нават уявіць сабе да канца не дадзена, якіх намаганняў, якой душэўнай моцы каштуе людзям з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі не толькі сваё жыццё зрабіць паўнавартасным і цікавым, а яшчэ і другім дапамагчы. Менавіта такія падзвіжнікі і аптымісты і павінны працаваць у рэабілітацыйных цэнтрах для інвалідаў, каб усяляць надзею, выхоўваць найперш сваім прыкладам. Лепшая псіхатэрапія. Нават для здаровых. Гледзячы на гэтых людзей, абавязкова спытаеш сябе, ці на тое траціш сваё жыццё. І, вядома, згадаеш мізэрныя крыўды, нявартыя праблемы, непатрэбную мітусню, бязглуздыя канфлікты, якія нярэдка становяцца зместам нашага паўсядзённага існавання, атручваюць будні ды святы, спараджаюць стрэсы і дэпрэсіі. Тым з іх, хто загартаваў у сабе душэўную моц, не раззлаваўся на ўвесь свет, дай рукі-ногі — яны б горы перавярнулі. Бо ўмеюць вызначыць галоўнае, бачаць і адчуваюць многае лепш за нас. Не прыгадаю зараз, хто сказаў пра Ніну Мацяш: «Яе асабістае няшчасце абярнулася шчасцем для ўсёй беларускай літаратуры». Ніна пакінула для нас не толькі цудоўныя вершы, але і ўспамін пра сябе як надзвычай светлага, як цяпер кажуць, пазітыўнага чалавека.

Пазітыву нам у гэтых людзей не грэх і павучыцца. А яшчэ аддаць даўгі... Інвалідам можа стаць кожны і ў любую хвіліну. Не ўсе ж нараджаюцца пазбаўленымі магчымасці хадзіць або бачыць... Вунь колькі людзей становяцца абмежаванымі ў руху пасля траўм і аварый! А мы... Пагаворым пра безбар'ернае асяроддзе, нешта быццам бы зробім. Але, як заўсёды, не да канца. Тая ж Галіна Пятроўна, якую я згадвала ў пачатку, заўважыла, што ў пад'ездзе яе дома пандус ёсць, толькі без старонняй дапамогі яна па ім не паднімецца. Што ўжо казаць пра многія і многія ўстановы, калі нават уваходы-выхады ў жылых дамах далёка не ўсюды «безбар'ерныя» для інвалідаў. Памятаю, як у свой час намучылася з дзіцячай двухмеснай каляскай, якая не ўлазіць ні ў ліфт, ні ў дзверы панэльнага шматпавярховага дома. Тады ў думках я ўсім праекціроўшчыкам жылля жадала займець у якасці падарунку лёсу тройню. Але ж дзіцячая каляска — рэч на год—два. Не хочацца думаць, што могуць пажадаць абмежаваныя фізічна людзі астатнім, якія мала што робяць для іх. Таму што інваліды, як і ўсе, маюць права атрымаць адукацыю, потым работу, штодзень выходзіць з дому. На тое і ствараўся вышэйзгаданы цэнтр, які часова не працуе.

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў нашага парламента Леанід Кавалевіч сказаў аднойчы ў размове-інтэрв'ю: «Калі ты здаровы, то на любой пасадзе павінен зрабіць нешта для людзей з абмежаванымі магчымасцямі». Леанід Мікалаевіч пацвярджае гэта і справамі. Раней, калі быў начальнікам раённай ЖКГ, — дапамагаў інвалідам, і цяпер, стаўшы «прафесійным» парламентарыем, робіць гэта. Ён мне і расказаў пра жыхара Івацэвіцкага раёна Анатоля Галушку. Паэт і мастак пазбаўлены магчымасці трымаць пэндзаль ці аловак рукой. Ён стварае свае творы, заціснуўшы інструмент зубамі. А нядаўна выйшла яго кніга «Сляды на пяску». Там ёсць такія радкі:

Дай, Божа, быць шчаслівым тым, што маю,
Дай, Божа, аддаваць, а не прасіць.
Усмешкі слодыч, горыч слёз — прымаю:
Дай моцы злосці ў сэрцы не насіць.

Хто асмеліцца спрачацца з тым, што гэтыя «абмежаваныя» людзі падышлі да ісціны бліжэй за нас, «неабмежаваных»?..

■ Вакол медыцыны са Святланай Дзянісавай

ЛІСТЫ ДА ЖЫЛІБЕРА

Bonjour, mon cher!

Калі Вы, канешне, дазволіце так сябе называць, асабліва пасля таго недапушчальна доўгага перапынку, які я, даруйце, незнарок усталявала ў гэтым нашым дзіўным ліставанні. Прынамсі, наўрад ці можна зваць яго ўдалым — бо яно аднабаковае, па-першае, і з налётам часцінак вечнасці, па-другое. Мне вось зараз нават чуецца тужлівае рыпенне: яно, як мне ўяўляецца, абавязкова павінна суправаджаць працэс адпраўкі маіх лістоў да Вас — хаця б таму, што карыстальнікаў у машыны часу дагэтуль, як ні дзіўна, набіраецца няшмат, а механізмы яе мала што састарэлыя, дык ад разу да разу паспяваюць як след пакрыцца тымі самымі драбнюткімі часцінкамі вечнасці… Пылам часу… Ды якое там?! Звычайным пылам. Бо такая ўжо natura rerum, ці, як кажуць у нас, прырода рэчаў. Ці пагодзіцеся, *monsieur Jean,* што пыл часу ў рэестры з'яў і падзей Сусвету мае такі самы ідэнтыфікацыйны нумар, які носіць шэрае покрыва большасці кніжных паліц? І я б з задавальненнем, бачыць Бог, пагаварыла з Вамі пра тыя паліцы, не кранаючы пылу, але крануць яго, вечнага ворага, — давядзецца.

«Пыл» — тэрмін увогуле чыста медыцынскі. Калі б не было так, не было б цэлай галіны аховы нашага здароўя. Нават некалькіх. Я ведаю, што пішу. З той пары, *monsieur,* як Вы (таксама ж незнарок) адбылі назад у свой Ліён (пакінуўшы, прабачце, без увагі пыл Гародні), прамінула больш за дзвесце гадоў. За гэты час у медыцыне яскрава вылучыліся асобныя раздзелы. Назвы якіх, між іншым, у сваёй пераважнай большасці гучаць чамусьці на манер жаночых імёнаў: імуналогія, алергалогія… Навукі-імёны бліскуча гучаць, а пыл — застаецца пылам, нечым цьмяным, не вартым увагі. Але ці напраўду ўсё так?

Сучасныя медыкі кажуць, што хвароба стагоддзя пад мілагучнай назвай «алергія» народжана шмат чым. Шмат чым адначасова. Але ледзь не ў першай чарзе гэтага шмат чаго — жаданне чалавека пазбавіцца сякіх-такіх праблем. У прыватнасці, праблем са здароўем. Так, я згодна, гэта вельмі дзіўна гучыць. Але ж і дзіўна выглядае. Праблема з'яўлення пылу на дываны і паліцах вырашаецца працэсам стварэння сродкаў, якія, выцясняючы гэты пыл як не карысную для здароўя з'яву, ствараюць… новую з'яву. І вось ужо адна справа — простая рэакцыя арганізма на просты пыл (рэакцыя арганічнай субстанцыі на арганічнае ж рэчыва, праяўляецца у горшым выпадку чыханнем ці кашлем), і зусім іншая — імунны, як кажуць медыкі, адказ. Інакш кажуць, рэакцыя імуннай сістэмы, цалкам справядлівая і досыць неадназначная, на дзеянне нечага чужароднага, хоць на пах і смачнага.

…За ўсё ў гэтым свеце нам трэба плаціць. Думаю пра гэта кожны раз, калі пырскаю на шкло акна ці выціскаю на гумку для посуду духмяны мыйны сродак. А Ваша жонка, *monsieur Jean,* — колькі памятаю, яе імя мадам Жанэта — ці марыла калі пра такую гаспадарчую акалічнасць?..

З палкім унутраным спадзяваннем на тое, што механізмы перадачы эмоцый і сімвалаў праз час і прастору — з майго поўнага ідэй па перастварэнні рэальнасці XXI стагоддзя ў Ваша адзначанае не менш бліскучымі думкамі XVIII стагоддзе — усё яшчэ пакрывае звычайны шэры пыл, заўсёдны суразмоўца папяровых кніжак (як гэта мне дабрацца да Вашай «Флоры Літвы»?), шлю развітальнае слова да наступнай нагоды напісаць тут: «Я зноў пішу Вам, *monsieur Jean*»

■ Экслібрыс «Звязды»

СТРУКТУРЫЗАЦЫЯ

ВЫЙШЛА КНІГА, ЯКАЯ ДАПАМОЖА «ЎЕХАЦЬ» У ЛІТАРАТУРУ

Бязлепкіна, А.П. *Сто слоў пра сучасную беларускую літаратуру/ А.П. Бязлепкіна.— Мінск: Лімарыус, 2012.— 224 с.*

Гэтак павялося, што ў нашым літаратуразнаўстве «па змоўчанні» ўсё ёсць: і гісторыя літаратуры, і тэорыя, і энцыклапедыі, і падручнікі, і зборнікі дакументаў, і бліскуча падрыхтаваныя і адкаментаваныя тэкстолагамі выданні ўсіх значных пісьменнікаў — выбірай на свой густ, атрымлівай асалоду і глыбіню ведаў, уменняў, навыкаў.

Аднак пачаўшы, уласна кажучы, выбіраць, заўважаеш рознага кшталту парадоксы, «белыя» (а то і «чорныя») плямы, правалы, недахопы і аднастайнасць кніжнага рынку.

Апошняе — дык стапрацэнтна. Сапраўды добрую беларускую літаратуразнаўчую кніжку шукаць трэба не ў звычайных кнігарнях, а ў букіністычных аддзелах, куды, паводле зусім зразумелых прычын, яна трапляе не кожны дзень. У выніку на якую класічную работу Мальдзіса, Кісялёва, Бярозкіна, Кабаковіч, Каханоўскага, Ралько «палюеш» не адзін год, а пераважна чытаеш у бібліятэцы (і пераважна — у адной з найбуйнешых, бо ў астатніх далёка не заўсёды тую кніжку знойдзеш).

Такія парадоксы, зрэшты, зразумелыя: кола літаратуразнаўцаў дастаткова вузкае, таму адмысловых захадаў па папулярызацыі іх навуковай прадукцыі рабіць быццам бы і не варта — раскупілі б хаця тое новае, што выдаецца. Праўда, пры гэтым забываюць пра 5 тысяч настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, а таксама выкладчыкаў ВНУ… Як ім атрымаць добрую не метадычную, бо з гэтым куды прасцей, а літаратуразнаўчую кніжку?

І найбольшая праблема тут у разуменні сучаснай беларускай літаратуры. Звычайна яе вывучэнне заканчваецца дзевяностымі гадамі. І гэта ў найлепшым выпадку. Далей — поўны змрок і натомленасць духу. Калі ў Мінску яшчэ ўяўляюць усю складанасць сітуацыі, то «на мясцох» адчуць усе нюансы значна складаней. Да таго ж «новая беларуская літаратура», якая паўстала пасля абвяшчэння незалежнасці, не ўпісваецца ў прыгожыя схемы літаратуры савецкай.

Адпаведна, назіраецца істотны падзел: пра Шамякіна, Быкава і Мележа як быццам усё ведаем, а далей — правал у бессвядомае. Таму і школьнікі, і студэнты, якіх нейкім ветрам часам заносіць у шэрагі сучасных беларускіх літаратараў, напачатку ўваходзяць у шокавы стан: колькі новых імёнаў трэба запомніць, знакавых кніг, падзей, арганізацый, суполак, прэмій, разабрацца ў так званых «літаратурных пакаленнях», адметнасцях у найноўшай прозе і паэзіі на беларускай мове. Задача гэтая, зрэшты, нават прыемная для чалавека, апантанага літаратурай. Аднак для таго і існуюць філолагі, каб спрашчаць людзям жыццё, прыводзячы ўсё ў сістэму.

Прыкладам падобнай структурызацыі, і даволі ўдалым, варта лічыць новую кніжку Аксаны Бязлепкінай «100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру». Праца яе даволі кампактная, але гэта не азначае, што аўтарка абмежавалася дэкларованымі 100 словамі. Апошнія ў нашым выпадку азначаюць сто слоўнікавых артыкулаў, размешчаных у алфавітным парадку, якія і ўтвараюць кнігу.

Такім чынам, гэта «нелінейнае літаратуразнаўчае чытво». Усім, хто бярэ кнігу ў рукі, адразу прыгадваецца знакаміты «Паэтычны слоўнік» Рагойшы, які неаднаразова перавыдаваўся. У той жа час Бязлепкіна, бясспрэчна, не мела на мэце засяроджвацца выключна на паэзіі, характар слоўнікавых артыкулаў у яе кнізе дастаткова стракаты. Тут ёсць персанальныя артыкулы пра пісьменнікаў, творчасць якіх, на думку аўтара, вызначае характар сучаснага літаратурнага працэсу (У. Арлоў, В. Быкаў, А. Глобус, У. Караткевіч, А. Разанаў, А. Сыс, А. Федарэнка, А. Хадановіч); таксама аналізуюцца жанры найноўшай літаратуры (разам з натуральнымі для даведніка артыкуламі

«Апавяданне», «Аповесць», «Навела», «Паэма» можна сустрэць і дагэтуль нязвыклыя для чытача беларускамоўнай кнігі «Альтэрнатыўная гісторыя», «Комікс», «Перформанс», «Фэнтэзі»). Хапае ў кнізе звестак пра самыя розныя літаратурныя аб'яднанні і арганізацыі, прэміі, маніфесты. Не забывае аўтарка і пра тэорыю літаратуры, звязваючы з паняццямі і тэрмінамі канкрэтныя тэксты. Ёсць у кнізе і даволі сумнеўнае, але, тым не менш, часта ўжыванае разасабленне літаратуры па тэматыцы (побач з «Ваеннай прозай», «Вясковай прозай», «Гістарычнай прозай», «Дзіцячай літаратурай» тут можна пачытаць і пра «Жаночую паэзію», «Жаночую прозу», «Рэлігійную тэму ў літаратуры», «Чарнобыльскую тэму», «Эратычную літаратуру»). Падзел гэты ўмоўны і, па вялікім рахунку, надуманы, але ў нашым літаратуразнаўстве прыжыўся. А Бязлепкіна ў прадмове абачліва папярэджвае: «У гэтай кнізе сучасная беларуская літаратура паўстае такой, якой яе бачаць сучасныя беларускія літаратуразнаўцы і крытыкі. Такім чынам, кніга з'яўляецца падсумаваннем работы айчыннага літаратуразнаўства і крытыкі, своеасаблівым іх люстэркам».

Што сказаць, адбітак у люстэрку не заўсёды выглядае прывабна. Таму структурызатар, які вымушаны рабіць спасылкі на галіновыя работы, у нас вельмі моцна рызыкуе. Бо асобныя кірункі яшчэ не распрацаваны, не так шмат і манаграфій, прысвечаных асобным сучасным пісьменнікам. Відаць, таму і кніга Бязлепкінай атрымалася крыху хаатычнай і «раскіданай». Карціна літаратуры ў ёй — тыя аскабалкі, якія асвоены сучасным літаратуразнаўствам.

Вось жа, не будзем доўга затрымлівацца на недахопах (бо для іх аналізу варта пісаць асобную рэцэнзію) і пасумуем у чарговы раз над доляю аналітыкаў сучаснай літаратуры, прыгадваючы вядомы эпіграф да п'есы «Рэвізор». Доля гэтая складаная, бо крытык і літаратуразнаўца не паспявае за развіццём літаратуры. У найлепшым выпадку, ён можа рухацца разам з ёю, падспудна «ўрубаючыся», скажам так, у мову і генезіс. А ў горшым — збіваецца на штампы пра тэму, тэндэнцыю і біяграфію. Чытаючы «100 слоў пра сучасную беларускую літаратуру», я не раз рабіў «птушачкі», хацеў нешта перапісаць, дадаць і аспрэчыць. А ці не гэта доказ таго, што кніжка ўдалася? Для тых, хто толькі адкрывае свет «сучбелліту», выданне будзе надзвычай карыснае.

Бо толькі здаецца, што беларуская літаратура скончылася на Шамякіну з Караткевічам. Дастаткова зрабіць крок — і цябе літаральна заваліць добрымі кнігамі. Квітком у гэтае вясёлае балота і з'яўляецца кніга Аксаны Бязлепкінай.

Шчаслівай дарогі!

Ціхан ЧАРНЯКЕВІЧ

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА БЕЗ УСЛОВИЙ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

